Цана асобнага нумару 10 кап.

Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
פּראָלעטאַריער פון אַלע לענדער, פאַרייניקט זיך!
Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

16-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і СНК БССР
XIII ГОД ВЫДАНЬНЯ
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА

СЕРАДА
15 САКАВІКА 1933 г.
№ 59 (3719)

Аб прасоўваньні пасеўных грузаў і грузаў шырспажыву па чыгунках БССР і Беларускай канторы Саюзтрансу

Пастанова ЦК КП(б)Б

1. На радзе чыгуначных станцый і ў канторах Саюзтрансу назіраецца злачынна - халатныя адносіны да справы прасоўваньня грузаў для пасеўнай кампаніі і грузаў шырспажыву. Мае мейсца вялікая колькасьць грузаў без дакумантаў, якія ляжаць на складах станцыі: доўгі час не рэалізаванымі.

Начальнік ст. Менск т. Васільеў і Нач. Мен. Аддзяленьня Саюзтранса—Горны не вялі рашучай барацьбы за чоткую работу сваіх апаратаў у справе своячасовага прасоўваньня грузаў для пасеўнай кампаніі.

2. За замараживаньне грузаў на працягу доўгага часу, якое даходзіла ў пасобных выпадках да 6 месяцаў па таварнай станцыі Менск (трактарныя часткі, жалезо розных гатункаў, каляровыя мэтал., прадметы шырспажыву і г. д.)—абвясьціць вымову начальніку ст. Менск т. Васільеву і прыняць да ведама, што Горны—Начальнік Менскай Канторы Саюзтрансу выключаны з партыі і зьнят з працы.

3. Папярэдзіць начальнікаў чыгуначных станцый, начальнікаў раёнаў, Дыр. Бел. Кант. Саюзтрансу, што ў выпадку няпрыняцьця імі неабходных мер да своячасовага атрыманьня грузаў клієнтамі і рэалізацыі ва ўстаноўленыя тэрміны незатрэбаваных і без дакумантных грузаў, згодна ўказаньня НКШЗ, яны будуць прыцягнуты да суровай партыйнай і судовай адказнасьці.

4. Прасіць ЦККК тэрмінова прыцягнуць да партадказнасьці кіраўнікоў арганізацый, вінаватых у несвоячасовым атрыманьні грузаў.

5. Абавязаць начальнікаў чыгуначных раёнаў т. т. Васільева, Канькова, Адамава, Дземуськова і начальніка Бел. Канторы Саюзтрансу—т. Анціпкіна ўстанавіць штодзённую праверку фактычнага становішча пагрузкі, прасоўваньня і выгрузкі пасеўных грузаў і шырспажыву, прыцягваючы вінаватых у затрыманьні грузаў да суровай адказнасьці, устанавіўшы адпраўку трактарных частак і бабіту з пасажырскімі паездамі, незалежна ад таго, як яны здадзены да адпраўкі, і надаваць вагоны пад пагрузку трактароў у першую чаргу.

6. З прычыны наяўнасьці выпадкаў, што канторы Саюзтрансу затрымліваюць на сваіх складах па некалькі дзён трактарныя часткі, абавязаць т. Анціпкіна, каб трактарныя часткі і бабіт безадкладна па прыёме іх перадаваць па асобных перадатачных аедамасьцях пасажырскім станцыям для адпраўкі іх пасажырскімі паездамі.

Спаборніцтва саветаў на лепшую падрыхтоўку да сяўбы

падначаліць цэнтральнай задачы—барацьбе за ураджай

Саветы Гарадокшчыны абмежаваліся пустой дэклярацыяй: у раёне не засыпана насеньне, не адрамантаваны інвэнтар

Пра падрыхтоўку конскай цягавай сілы да веснавой сяўбы

Пастанова СНК БССР і ЦК КП(б)Б ад 13 сакавіка 1933 г.

Савет Народных Камісараў БССР і Цэнтральны Камітэт КП(б)Б адзначаюць, што праверка выкананьня пастановы СНК СССР і ЦК УсеКП(б) ад 10 лютага паказвае зусім нездавальняючае становішча работы па падрыхтоўцы рабочых коняй да веснавой пасеўнай кампаніі.

Наркамзем, Упаўнаркамсаўгасаў, саўгастрэсты, РК КП(б)Б, РВК і МТС ня прынялі на справе канкрэтных мер да рэалізацыі пастановы ад 10 лютага і, фактычна, падрыхтоўкай жывой пугавай сілы да веснавой сяўбы не займаюцца.

У радзе саўгасаў і калгасаў пастанова СНК СССР і ЦК УсеКП(б) ня толькі не рэалізавана, але не растлумачана рабочым саўгасаў і калгасьнікам.

У выніку бязьдзейнасьці і безадказных адносін да каня з боку шэрагу праўленьняў калгасаў і дырэктароў саўгасаў, адсутнасьці клясавай пільнасьці да шкодніцкай работы кляса-варожых элемэнтаў, накіраванай на зьнясіленьне і зьнішчэньне конскага пагалоўя, наглядаюцца шматлікія выпадкі падзежу коняй, драпежніцкага скарыстаньня іх на рабоце, калецтва, вымушаных абортаў, сьвядомага некармленьня і непаеньня, перагонаў і апояў (калгасы «13-годзьдзе Кастрычніка», «Іскра», Сьветлы шлях», саўгасы «Чырвоны Кастрычнік», «Ударнік», Чэрыкаўскага раёну, калгас «Пяцігодка ў чатыры гады», Дзяржынскага раёну, калгас «Інтэрнацыянал» і «Сацыялістычная бацькаўшчына», Лёзьненскага раёну, «Новы шлях», Асьвейскага раёну, «Серп і молат», Нараўлянскага раёну, калгас «Случ» № 3, «Шляхі калектывізацыі» і саўгас «14 партызан» Слуцкага раёну і г. д.).

Ня глядзючы на прамыя і ясныя дырэктывы СНК СССР і ЦК УсеКП(б) ад 10 лютага і рад дырэктыў ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб зьнішчэньні недахопаў у кармленьні, утрыманьні і догляде, да гэтага часу коні не разьбіты на групы па іх працаздольнасьці, не прымацаваны да пэўных конюхаў, рабочых саўгасаў і калгасьнікаў, працуючых на конях; дапускаюцца частыя зьмены ў прымацаваньні коняй, адсутнічае сталы распарадак работ на стайні што прыводзіць да нерэгулярнага кармленьня, паеньня і адпачынку коняй; ігнаруюцца элемэнтарныя правілы ўтрыманьня і догляду (чыстка, расчыстка капыт, своечасовая коўка, утрыманьне ў стойлах і на прывязі).

Практычныя работы па стварэньні кармавых фондаў для забясьпечаньня коняй на час пасеўнай кампаніі падмяняюцца апартуністычнымі разважаньнямі аб адсутнасьці кармоў, асабліва канцэнтраваных. Разам з гэтым у радзе калгасаў і саўгасаў, якія маюць напружанае становішча з кармамі, расходваньне кармоў праводзіцца незнаёмна, бескантрольна і кармы проста расьцягваюцца антысавецкімі элемэнтамі на вачох праўленьняў калгасаў, адміністрацыі саўгасаў, партыйных ячэек і прафорганаў, што, па сутнасьці, зьяўляецца простай дапамогай антысавецкім элемэнтам у іх шкодніцкай рабоце.

Антысавецкая і антыкалгасная шкодніцкая работа клясава-варожых элемэнтаў не заўсёды сустракае рашучы адпор з боку партыйных ячэек, дырэктароў саўгасаў і праўленьняў калгасаў (саўгас «Дземкіна», «Собалева», калгас «Непераможны», Дубровеньскага раёну і інш.).

Савет Народных Камісараў БССР і Цэнтральны Камітэт КП(б)Б ПАСТАНАЎЛЯЮЦЬ:

1. Абвясьціць з 16 па 26-III дэкаднік праверкі і рэалізацыі пастановы СНК СССР і ЦК УсеКП(б) ад 10-га лютага 1933 г.

Абавязаць РК КП(б)Б, РВК, РККРСІ шляхам пасылкі спэцыяльных упаўнаважаных у кожны калгас і саўгас на аснове разгортваньня масавай работы сярод рабочых саўгасаў і калгасьнікаў праверыць выкананьне пастановы ад 10 лютага і аказаць практычную дапамогу ў правядзеньні канкрэтных мерапрыемстваў, зьвязаных з падрыхтоўкай цягавай сілы да веснавой сяўбы.

Абавязаць Камсамол, як шэфа над кайём, распрацаваць і правесьці рад канкрэтных апэратыўных мер у сувязі з дэкаднікам праверкі выкананьня пастановы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР.

2. Асноўнымі задачамі дэкаднику паставіць:

а) Разьбіўку коняй па групах працаздольных і слабасільных і арганізацыю лепшага кармленьня, догляду слабасільных коняй, з вызваленьнем іх ад усякіх работ, рашуча змагаючыся з імкненьнем клясавага ворага скарыстаць гэта мерапрыемства для зрыву чарговых гаспадарча-палітычных кампаній (вывазка ўгнаеньня, лесавывазка і г. д.).

б) стварэньне кармавых фондаў і арганізацыя правільнага расходваньня, уліку і аховы кармоў; арганізацыя міжкалгаснай узаемадапамогі паміж калгасамі, маючымі ліішкі грубых кармоў і калгасамі, яе забясьпечанымі кармамі.

в) падбор для работы на стайнях лепшых, праверaных калгасьнікаў замест сацыяльна-чуждых элемэнтаў і недобрасумленных калгасьнікаў, не забясьпечваючых пасыпяховую падрыхтоўку коняй да веснавой сяўбы.

г) устанаўленьне правіл унутранага распарадку на стайнях, забясьпечваючых правільнае кармленьне, догляд і адпачынак коняй і нармальную нагрузку іх у часе работы ў адпаведнасьці з працаздольнасьцю.

д) прымацаваньне коняй да пэўных рабочых саўгасаў і калгасьнікаў на ўвесь пэрыяд с-г работ, падбор і рэмонт ўпражы.

е) Падрыхтоўка да злучнай кампаніі і ахова жаробных матак.

ж) арганізацыя грамадзкага кантролю ў саўгасах і калгасах за поўным ажыцьцяўленьнем пастановы ад 10 лютага.

3. Абавязаць Наркамзем і Упаўнаркамсаўгасаў у 3-дзённы тэрмін распрацаваць і распаўсюдзіць масавым тыражом прыкладныя правілы ўнутранога распарадку на стайнях ў саўгасах і калгасах.

4. Прапанаваць рэдакцыям цэнтральных і раённых газэт наладзіць сыстэматычнае з'яцленьне ходу работ па падрыхтоўцы цягавай сілы да сяўбы і на прыкладзе канкрэтных калгасаў паказаць, як трэба арганізаваць утрыманьне, кармленьне і догляд коняй.

5. Абавязаць РК КП(б)Б, РВК і МТС пры складаньні вытворчых плянаў у калгасах асабліва дакладна прапрацаваць пытаньне аб увязцы работы коняй з трактарамі.

6. Прапанаваць пракурору Рэспублікі забясьпечыць разгляд на працягу ня больш 5-ці дзён спраў адносна падзежа коняй, драпежніцкіх адносін да іх і разбазараньня кармавых фондаў.

7. Абавязаць Наркамзем, Упаўнаркамсаўгасаў, РВК, саўгастрэсты і МТС на працягу ўсяго часу падрыхтоўкі і правядзеньня веснавой сяўбы арганізаваць сыстэматычны нагляд і кантроль за становішчам конскай цягавай сілы ў парадку апэрацыйнай работы, неадкладна рэагуючы на кожны канкрэтны выпадак дрэннай пастаноўкі справы.

Устанавіць дэкадную апэрацыйную справаздачу аб падрыхтоўцы цягавай сілы да веснавой сяўбы.

8. Абавязаць РК і РКК КП(б)Б не пазьней 28 сакавіка падвесьці вынікі правядзеньня дэкадніка і матар'ялы прадставіць ЦК КП(б)Б.

СТАРШЫНЯ СНК БССР
ГАЛАДЗЕД

САКРАТАР ЦК КП(б)Б
ГІКАЛО

Сацспаборніцтва саветаў—на вышэйшую ступень

5 сельсаветаў Случчыны ўзялі на сябе ініцыятыву па разгортваньню міжраённага Усебеларускага спаборніцтва саветаў на лепшую падрыхтоўку і правядзеньне веснавой сяўбы. Ухваляючы ініцыятыву пяці сельсаветаў, бюро Слуцкага РК КП(б)Б і РВК у сваёй пастанове выклікалі на сацспаборніцтва саветы Бабруйскага раёну.

На сёнешні дзень ініцыятыву саветаў Случчыны падхапіла зусім нязначная колькасьць раёнаў. Уключыліся ў міжраённае спаборніцтва Бабруйскі раён, выкліканы Случчынай, Гарадоцкі, Шклоўскі, Талачынскі, Клічаўскі і Асіпавіцкі раёны. Рэшта раёнаў ў такі выключна адказны момант падрыхтоўкі да сяўбы аднесьліся да сацспаборніцтва саветаў пасыўна.

Ня трэба забываць, што саветы павінны адыграць выключную ролю ў арганізацыі веснавой сяўбы, і іменна саветы ў першую чаргу нясуць адказнасьць за ажыцьцяўленьне цэнтральнай задачы—павышэньня ўраджайнасьці. адсюль, задача саветаў, на даным адрэзку часу—падначаліць усю сваю штодзённую работу задачам барацьбы за поўную, своячасовую падрыхтаванасьць да сяўбы.

Дрэнна разгортваецца ўнутрыраённае спаборніцтва. Пакуль мы маем толькі тры сельскія саветы (Кашкаўскі, Біскаўскі, Сьвіслацкі), якія на пленумах абгаварылі вызаў саветаў Случчыны і прынялі рашэньне аб разгортваньні спаборніцтва.

Але нельга заспакойвацца на голым прыняцьці выклікаў і на вынясеньні адпаведных рашэньняў. У гэтым яшчэ далёка не галоўнае. Сацспаборніцтва будзе дзейсным толькі тады, калі яно ахопіць увесь савецкі актыў, шырокія калгасныя і бядняцка-серадняцкія масы, не замкнецца ў сьценах канцылярыі, а рушыць масу на ажыцьцяўленьне практычных падрыхтоўчых работ да сяўбы.

Сацспаборніцтва трэба арганізаваць так, каб спаборнічалі саветы не фармальна, не на паперы, а на практычнай справе, на канкрэтнай штодзённай рабоце. Трэба, каб кожны член савету актывіст на вёсцы меў канкрэтны абавязак удзелу ў падрыхтоўцы калгасу да вясны, адказваў-бы за сваю работу. Толькі ў гэтым выпадку сацспаборніцтва будзе стаяць на належнай вышыні.

ХАРЛЕЎСКІ—аднаасобнік вёскі Астровы (Менскі раён), дэлегат зьлёту, выступіў на зьлёце з заявай аб жаданьні ўступіць у калгас.

Трэба з усёй рашучасьцю весьці барацьбу з дэкларацыйнасьцю, фармальным уключэньнем у спаборніцтва. Мала ўключыцца, трэба на справе паказаць сапраўдную бальшавіцкую работу ў падрыхтоўцы да сяўбы. А аб тым, што такая дэкларацыйнасьць ужо дзе-ні-дзе мае месца, аб гэтым гавораць факты.

Так, Гарадоцкія раённыя арганізацыі абмежаваліся простым штампам, г. зн. вынесьлі рашэньне аб уключэньні ў спаборніцтва і на гэтым паставілі кропку. Тым часам у раёне дрэнна разгортваецца падрыхтоўка да сяўбы, не скончан рэмонт сельска-гаспадарчага інвэнтару.

Вось, на гэты бок справы неабходна зьвярнуць увагу кожнаму сельсавету, кожнай дэпутацкай групе, кожнаму дэпутату пры заключэньні сацспаборніцтва.

Сакратару ЦК КП(б)Б тав. ГІКАЛО, Старшыні Саўнаркому БССР тав. ГАЛАДЗЕДУ, рэдакцыям газэт: „Зьвязда" і „Савецкая Беларусь"

Рапарт

Пад ленінскім кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б і пры штодзённым актыўным удзеле і дапамозе з боку раённых партыйных і савецкіх арганізацый, мабілізаваўшы шырокія масы калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў на барацьбу з кулацкім сабатажам—Любаньскі раён дабіўся перамогі на фронце лесазагатоўкі і вывазкі.

Плян па загатоўках дроў 1 кварталу на 11 сакавіка выкананы на 102 проц., будаўнічага матар'ялу—124 проц. Вывезена дроў—162 проц., будаўнічага матар'ялу 101 проц.

Змагаемся за далейшае перавыкананьне пляну.

Райком КП(б)Б АВУС
Райвыканком КЛІМАЎ
Леспрамгас ШМЫГА

Наркамфіну і Кіраўніцтву ашчадкасамі БССР

Пастановай дырэктыўных органаў Наркамфіну прапанавана закончыць да першага мая гэтага году суцэльную праверку аблігацый. Гэтае мерапрыемства надзвычайна павышае адказнасьць за пасыпяховае правядзеньне дня пазыкатрымальніка, поўнае выкананьне пастаўленых перад кампаніяй задач.

Прапаную дабіцца скончэньня правядзеньня дня пазыкатрымальніка па ўсіх раёнах. Таксама папярэджваю, што без выкананьня пляну па пазыцыі ня будзем лічыць кампанію закончанай.

Нарком Фінансаў СССР
ГРЫНЬКО.

80 ударнікаў накіраваны ў адстаючыя сельсаветы

БАБРУЙСК. (наш кар.). Скончыў сваю работу раённы зьлёт калгасьнікаў-ударнікаў, які прыняў адозву да працоўных аднаасобнікаў і калгасьнікаў раёну. У гэтым дакуманце зьлёт вызначыў канкрэтныя шляхі рэалізацыі адозвы Усесаюзнага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў.

Вітаючы ініцыятыву саветаў Случчыны аб разгортваньні міжраённага спаборніцтва, зьлёт у сваім звароце заявіў, што ўмову змаганьня за мандат на Усебеларускі зьезд калгасьнікаў-ударнікаў кожны калгасьнік кладзе ў аснову спаборніцтва са Случчынай.

80 лепшых ударнікаў-калгасьнікаў, удзельнікаў зьлёту накіраваны ў адстаючыя сельсаветы для практычнай дапамогі ў падрыхтоўцы да сяўбы і разгортваньні спаборніцтва.

ДАМБРОЎСКІ

Райза ў ролі штампоў шчыка

ГАРАДОК. (Наш спэцкор.). Становішча з засыпкай насеньня і страхавых фондаў, а таксама з ачысткай насеннага матар'ялу па Гарадоцкаму раёну пагражаючае. Райза і Загот зерне ня ведаюць, колькі на сёнешні дзень засыпана насеньня, колькі ачышчана. Больш таго, райза невядома, колькі трэба засыпаць і ачысьціць насеннага матар'ялу, каб выканаць плян сяўбы.

Загадчык райза тав. Шнэйдэр замест дакладнага, канкрэтнага апэрацыйнага кіраўніцтва справай падрыхтоўкі да сяўбы, займаецца простай штампоўкай прысылаемых сельсаветам лічбаў. Што канкрэтна робіцца на месцах у сельсаветах, калгасах у выданьні падрыхтоўкі да сяўбы, аб гэтым Шнэйдэру невядома.

Заўважаецца блытаніна, неразьбярыха ў зводках райза, якія дасылаюцца райкому партыі і РВК. Так, на 28 лютага па зьвестках райза плян насенных і страхавых фондаў па збожжавых культурах на раёну выкананы на 99,7 проц., бульбы—на 78,8 проц. На 7 сакавіка райза дае зьвесткі ву сім іншыя; засыпка збожжавых культур згодна гэтай зводкі выкананна на 90,1 проц., бульбы—на 76,6 проц. і г. д.

Да сяўбы асталіся лічаныя дні, дорага кожная хвіліна. Але райза на чале з Шнэйдэрамі «і ў вус ня дуюць»... Гніты лібэралізм, самаўпакаеньне пранізала ўвесь апарат райза і само га загадчыка Шнэйдэра. Такое становішча ў кіраўніцтве калгасаў з боку райза пагражае сяўбе зрывам.

РК КП(б)Б і РВК трэба зрабіць адпаведныя вывады ў адносінах да райза. Трэба неадкладна ўзьняць тэмпы падрыхтоўкі да сяўбы, забясьпечыць пасыпяховае яе правядзеньне.

За ўраджай будзем змагацца па-ударнаму

ЦВК БССР тав. ЧАРВЯКОВУ, СНК БССР тав. ГАЛАДЗЕДУ

Шчырае бальшавіцкае прывітаньне шле вам першы раённы зьлёт калгасьнікаў - ударнікаў Чавусчыны. З вялікім посьпехам краіна забясьпечыла выкананьне пляну першай пяцігодкі. Сельская гаспадарка канчаткова зямцавалася на сацыялістычным шляху. Калгаснае сялянства вышла на шырокі шлях уздыму матар'яльнага і культурнага становішча.

Такіх посьпехаў мы дамагліся таму, што нашы кіруе рабоча - сялянскі ўрад, на чале з камуністычнай партыяй, сіла якога—у саюзе рабочых і працоўных сялян, якія будуюць новае сацыялістычнае грамадзтва.

Няхай ведаюць ворагі Савецкага Саюзу, што ў асобе калгаснага сялянства савецкая ўлада мае моцную апору ў вёсцы, вернага саюзьніка рабочай клясы. Па першаму заклику нашага работа сялянскага ўраду мы гатовы стаць на абарону недатыкальнасьці сацыялістычнай краіны.

Мы, калгасьнікі - ударнікі, ведаем, што вялікую дапамогу аказала нам пралетарская дзяржава. Выносячы шчырую падзяку партыі і ўраду, мы іх запэўніваем, што будзем змагацца за тое, каб рады ўдарнікаў папаўнялісь новымі сотнямі і тысячамі ўдарнікаў, за тое, каб калгасы нашы сталі сапраўды бальшавіцкімі на аснове рашучага змаганьня з кулакамі, лодырамі, злодзеямі, на аснове барацьбы за сапраўдную бальшавіцкую дысцыпліну, за павышэньне ўраджайнасьці.

Няхай жыве ЦВК і СНК БССР.

Няхай жыве ЦК УсеКП(б) на чале з нашым кіраўніком і настаўнікам тав. Сталіным.

Пад сьцягам барацьбы за ўраджай

КЛІМАВІЧЫ. (наш кар.). Закончыў работу раённы зьлёт калгасьнікаў-ударнікаў Клімаўшчыны. Зьлёт прайшоў пад знакам барацьбы за своячасовую падрыхтоўку да сяўбы. На зьлёце выступалі два дэлегаты. Усесаюзнага зьезду ўдарнікаў: т. т. Сьмяцкоў і Сараганоў, якія падзяліліся ўражаньнямі работы Усесаюзнага зьезду.

Калгасы «Серп і молат», «Новы сьвет» у гонар зьлёту арганізавалі пробны выезд у поле. Выезд паказаў, што калгасы гатовы да веснавой сяўбы.

На зьлёце была абмяркована пастанова ЦК і СНК БССР аб дапамозе Харкаўскай вобласьці насеннай бульбай. Па прапанове ўдзельніка зьлёту калгасьніка Цімашэнкі вырублена падтрымка для прадажы бульбы Харкаўшчыне. Сабрана 370 тон.

У гонар зьлёту перадавымі калгасамі «Кастрычнік», імя Сталіна прадана 7,6 тон хлеба дзяржаве.

Зьлёт паслаў прывітальныя тэлеграмы ЦК УсеКП(б) тав. Сталіну, тав. Вярашылаву, ЦК КП(б)Б тав. Гікало і СНК—т. Галадзеду.

Зьлёт зьвярнуўся з адозвай да ўсіх калгасьнікаў і аднаасобнікаў раёну з заклікам правесьці першую весну другой пяцігодкі па-ударнаму.

Уключыўшыся ў спаборніцтва саветаў зьлёт выклікаў на спаборніцтва Крычаўскі раён.

Я. КУЛІНКОВІЧ

Калгасьніца калгасу «Новы шлях», Дзяржынскага раёну, т. КАЗАКЕВІЧ член ЦВК СССР.

Выйдзем пераможцамі

ГАЛАДЗЕДУ, ЦО КП(б)Б «ЗЬВЯЗДА»

Мы, калгасьнікі - ударнікі Любаньшчыны вітаем КП(б)Б і савецкі ўрад. У аснове работы райзьлёту і ў аснове сваёй работы па сяўбе мы кладзем 5 вагароў па падняцьцю ўраджайнасьці нашых сацыялістычных палёў; гэта—барацьба за засыпку і ачыстку насеньня, за арганізацыю сталых вытворчых брыгад і жалезнай дысцыпліны ў іх, за севазварот, за агра-тэхніку і за прадажу збожжа дзяржаве.

ЦК КП(б)Б—ГІКАЛО, СНК БССР—

Мы выклікалі на спаборніцтва калгасьнікаў Стара-Дароскага раёну і запэўніваем ЦК КП(б)Б і СНК БССР, што ў гэтым сацспаборніцтве будзем пераможцамі.

Няхай жыве рабоча - сялянскі ўрад.

Няхай жыве ЦК КП(б)Б і яе кіраўнік тав. Гікало.

Няхай жывуць, шырацца рады калгасьнікаў-ударнікаў.

Пастанова ЦК КП(б)Б

Пастанова Бюро ЦК КП(б)Б

аб мерах, якія забясьпечваюць паскарэньне тэмпаў рамонту трактароў

У дадатак да прынятых мер ЦК і СНК лічаць неабходным прыняць наступныя меры:

Камандыраваць упаўнаважаных ЦК і СНК у наступныя рашаючыя пункты рамонту трактароў:

ПА ЛЁНАТРАКТАРАЦЭНТРУ — лічыць, што ўвесь рамонт зрываецца перш за ўсё з-за агіднай работы Гарадокскай і Горацкай МТМ. Назначыць упаўнаважаным ЦК і СНК па Гарадокскай МТМ тав. Селіванава (нам. кіраўніка лёнатрактарацэнтру), па Горацкай МТМ—т. Радзіонава; абавязаць іх закончыць рамонт трактароў да 17-га сакавіка, а матораў да 15-га сакавіка. Папярэдзіць т. т. Эльмана—Сакратара Гарадокскага РК КП(б)Б Чорнабродава — сакратара Горацкага РК, што калі МТМ у бліжэйшыя дні не забясьпечаць рамонту трактароў, будзе пастаўлена пытаньне аб кіраўніцтве.

ПА ГАРОДНА - БУЛЬБЯНАМУ ТРАКТАРАЦЭНТРУ—лічыць, што рамонт трактароў і матораў рашае:

а) Рагачэўская МТМ—камандыраваць у Рагачэўскую МТМ тав. Орсіка, прапанаваўшы яму забясьпечыць выкананьне праграмы да 15-га сакавіка;

б) Клімавіцкая МТМ—назначыць упаўнаважаным ЦК і СНК тав. Букалы манава, прапанаваўшы яму забясьпечыць выкананьне праграмы да 15-га сакавіка. Папярэдзіць тав. Еўсенка—сакратара Рагачэўскага РК і тав. Аллая — сакратара Клімавіцкага РК, што яны нясуць пэрсанальную адказнасьць за своячасовае скончэньне рамонту трактароў і матораў;

в) Барысаўская, Путчынская, Жлобінская і Смалявіцкая МТС; абавязаць тав. Грабенчыка камандыраваць у гэтыя МТС сваіх работнікаў.

Папярэдзіць сакратароў Барысаўскага РК тав. Чарнышова, Жлобінскага—тав. Плешакова, Смалявіцкага — тав. Кудмана, Дзяржынскага РК — т. Чумакова, што яны нясуць перад ЦК і СНК пэрсанальную адказнасьць за рамонт паказаных МТС. Прапанаваць ім, як упаўнаважаным ЦК, узяць пад непасрэднае кіраўніцтва работу МТС.

ПА ЗЕРНЯТРАКТАРАЦЭНТРУ — лічыць, што рамонт трактароў рашае:

а) завод імя Варашылава, які рамантуе 13 матораў Пухавіцкай МТС. Прапанаваць заводзкім арганізацыям (т. т. Дзічкоўскаму і Сосінаву) закончыць рамонт матораў да 12 гадзін 14-га сакавіка і здаць іх з тым, каб дапамагчы МТС устанавіць гэтыя маторы;

б) Бягомльская МТС — лічыць неабходным паслаць у Бягомльскую МТС таварыша, абавязаўшы яго перабудаваць работу МТС, каб рамонт трактароў закончыць да 17-га сакавіка;

в) Хойніцкая МТС — прапанаваць Гомельскай МТМ закончыць рамонт матораў Хойніцкай МТС да 14 сакавіка, абавязаўшы тав. Дубоўскага і Сакаленка забясьпечыць падрыхтоўку МТС да хуткай устаноўкі матораў;

г) Плешчаніцкая МТС — абавязаць тав. Дубоўскага пасторыць абточку валаў у Слуцкай МТМ і паслаць работнікаў у паказаную МТС;

д) Дамоўніцкая МТС — абавязаць т. т. Дубоўскага і Рохкінда ў сутачны тэрмін адправіць МТС неабходную колькасьць падшыпнікаў. Папярэдзіць сакратароў Пухавіцкага РК і КП(б)Б тав. Тарасава, Бягомльскага тав. Шпакоўскага, Мазырскага—Клімчука, Хойніцкага — Шаршнёва і сакратара парткалектыву імя Варашылава, што іх абавязак зьяўляецца забясьпечаньне скончэньня рамонту трактароў па паказаным МТС да 15-га сакавіка.

Па Упаўнаркамсаўгасаў — лічыць, што рамонт трактароў рашае:

а) Чэрыкаўская МТМ — камандыраваць туды ў якасьці ўпаўнаважанага ЦК і СНК тав. Бімбата (заг. сэктарам снабжэньня і збыта Упаўнаркамсаўгасаў).

б) Несьцкая МТМ — камандыраваць туды ў якасьці ўпаўнаважанага ЦК і СНК тав. Каралёва.

в) Бановьская МТМ — указаць т. Плятнёву (Упаўнаважаны ЦК) на неабходнасьць узмацненьня апэрацыйнага кіраўніцтва і папярэдзіць яго, што ён нясе перад ЦК і СНК непасрэдную адказнасьць за своячасовае скончэньне рамонту трактароў.

г) Бігосаўскі і Боркавіцкі саўгасы—камандыраваць туды ў якасьці ўпаўнаважанага ЦК і СНК тав. Балакіна (заг. спэцсэктарам Упаўнаркамсаўгасаў).

д) Завод «Красный Боец» — абавязаць тав. Чарнышова прыняць неабходныя меры для забясьпечаньня рамонту трактароў да 15-га сакавіка. Указаць тав. Чарнышову, што ён да гэтае пары нездавальняюча кіраваў рамонтам трактароў і работаю Аршанскага складу Белснабрамонту. Папярэдзіць сакратароў РК: Чэрыкаўскага — тав. Каца, Магілеўскага—Колодка, Полацкага — Пыжыкаве, Дрысенскага — Будзіна; што яны разам з дырэктарамі трэстаў адказваюць за своячасовы рамонт паказаных МТМ.

Прапанаваць Упаўнаркамсаўгасаў, саўгасным трэстам і трактарацэнтрам не пазьней 12-га сакавіка камандыраваць сваіх работнікаў ва ўсе рашаючыя пункты рамонту, МТМ МТС і саўгасы паведаміўшы Цэнтрапасеўкому прозьвішчы пасланых. Упаўнаважаным ЦК і СНК прасачыць за рэалізацыяй гэтага пункту пастановы.

Прыняць да ведама заяву т. т. Сьмірнова і Бімбата, што з прыбываючых з Масквы 322 агр. бабіту ўжо адгружаны 10-III-33 г. — 102 кгр., бабіт поўнасьцю задавальняе патрэбнасьці Упаўнаркамсаўгасаў.

Прапанаваць тав. Сьмірнову забясьпечыць неадкладную адпраўку нарочным. Прыняць да ведама заяву т. т. Орсіка і Рохкінда, што 9 сакавіка з Масквы адгружана звыш 1000 кгр. бабіту, поўнасьцю задавальняючага патрэбнасьць сыстэмы НКЗ. Абавязаць Снабрамонт не пазьней 12 гадзін 12-га сакавіка разнарадзіць паказаную колькасьць бабіту і паслаць спэцыяльнага работніка на Аршанскі склад, выклікаўшы з буйнейшых пунктаў спажываньня бабіту спэцыяльных нарочных для атрыманьня яго. Улічваючы, што ў бліжэйшыя дні тэмпы рамонту трактароў будуць залежаць у асноўным ад тэмпаў устаноўкі матораў, абавязаць Трактарацэнтры. МТМ, саўгасныя трэсты і ніжэйнаступныя РК КП(б)Б: Шклоўскі, Бешанковіцкі, Сураж скі, Сіроцінскі, Мсьціслаўскі, Барысаўскі, Магілеўскі, Хойніцкі, Пухавіцкі, Жлобінскі, Дзяржынскі, Бягомльскі, Мазырскі, Плешчаніцкі прыняць меры да таго, каб устаноўка матораў і абкатка трактароў адбывалася круглыя суткі, паслаўшы з гэтай мэтай у МТС дадатковы лік рамонтных рабочых.

Аб кантрактацыі лёну і канапель ураджаю 1933 г.

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР і Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б

У адпаведнасьці з пастановай Савету Працы і Абароны ад 26 лютага 1933 г. «Аб кантрактацыі лёну і канапель ураджаю 1933 г.» СНК БССР і ЦК КП(б)Б пастанаўляюць:

1. Зацьвердзіць на 1933 г. плян пасеву лёну па БССР у 260.000 га і канапель—30.000 га. Прадстаўлены Наркамземам плян пасеву лёну і канапель па сэктарах і раёнах зацьвердзіць.

2. Закантрактаваць з ураджаю 1933 году:

Лёну ў пераводзе на валакно	28.900 тон
У тым ліку:	
валакна сялянскай апрацоўкі	12.200 тон
і трасты для лёназаводаў (у пераводзе на валакно)	16.700 тон
75.600 тон трасты)	
Пянькі	2.600 тон
у тым ліку:	
пянькі - сырцу сялянскай апрацоўкі	2.000 тон
трасты і саломы для пеньказаводаў (у пераводзе на валакно)	600 тон
(трасты 3.400, саломы 1.000 тон)	
Насеньня лёну	23.000 тон
у тым ліку:	
селекцыйных	1.500 тон
Насеньня канапель	1.500 тон

Прадстаўлены УпаўкамзагСНК плян кантрактацыі лёну і канапель па сэктарох і раёнах зацьвердзіць.

Увага: У кулацка - заможных гаспадарках кантрактацыя не праводзіцца, а ім даюцца сельсаветамі цьвёрдыя заданьні па пасеву і здачы ўсёй валавой прадукцыі лёну і пянькі і на менш 70 проц. насеньня.

3. Прынадзеньне кантрактацыі ўсіх відаў прадукцыі лёну і канапель, а таксама правядзеньне ўсіх разьлікаў па кантрактацыйных дагаворах з усімі калгасамі і аднаасобнымі бядняцка-серадняцкімі гаспадаркамі ускласьці на Беларускую Кантору Загатлён і Белкаапсаюз, якія заключаюць кантрактацыйныя дагаворы з кожным калгасам і групамі аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Загатлён праводзіць кантрактацыю праз свае загатпункты, а Белкаапсаюз праз сваю сыстэму (райзагі), пры чым у кожным раёне кантрактацыю праводзіць толькі адна арганізацыя.

Прадстаўлёнае УпаўкамзагСНК разьмеркаваньне раёнаў паміж Загатлён і Белкаапсаюзам зацьвердзіць.

4. Абавязаць Беларускую Кантору Загатлён і Белкаапсаюз у 3 дзённы тэрмін заключыць паміж сабою адпаведны дагавор на правядзеньне Белкаапсаюзам кантрактацыі і загатоўкі кантрактуемай прадукцыі для здачы Загатлёну.

5. Кантрактацыю лёну і канапель пачаць безадкладна і скончыць не пазьней 25 красавіка 1933 году.

6. Устанавіць наступныя крайнія тэрміны здачы (продажу) заканктраванай прадукцыі дзяржаве (у процантах да гадавога пляну здачы).

Назва прадукцыі	Тэрміны здачы па месяцох					
	Верасень	Кастрычнік	Лістапад	Сьнежань	Студзень	Люты
Лён сялянскай апрацоўкі	5%	15%	25%	35%	20%	—
Львотраста і салома	10	35	40	15	—	—
Пянька сялянскай апрацоўкі	—	—	20	30	40	10.
Каапляян. салома	—	30	40	30	—	—
Пенькатраста	—	—	40	60	—	—
Льнонасеньне	30	35	25	10	—	—
Канаплянасеньне	—	30	45	25	—	—

7. Зацьвердзіць летапішня загатоўчыя цэны на ўсе віды прадукцыі лёну і канапель, апроч насеньня канапель, на якое ўстанавіць цану ў 10,5 кап. з цэнтнэра процант.

8. Прапанаваць Наркамзему, райвыканкомам і райкомам КП(б)Б:

а) для падвышэньня ўраджайнасьці і палепшаньня якасьці прадукцыі лёну і канапель адвесьці пад лён у першую чаргу канюшынчыны і прысялёбныя ўчасткі; арганізаваць поўнае; ўнясьне і скарыстаньне гною па ўстаноўленых нормах на ўсёй плошчы канапель і правесьці суровы нагляд за калгасамі, калгасьнікамі і аднаасобнікамі за своячасовасьці пасеваў і палепшаньня якасьці апрацоўкі глебы, уборкі і абмалоту лёну і канапель і абавязкова дабіцца своячасовай праполкі лёну і выбаркі плоскані ў 1933 годзе;

б) шляхам давядзеньня пляну пасеву да гаспадарак, замацаваць пад пасевы канапель у 1933 годзе старыя канаплянішчы, часткова прысялёбную зямлю, як тую, якая знаходзіцца ў агульным карыстаньні калгасаў, так і ў індывідуальным карыстаньні калгасьнікаў і аднаасобнікаў, забясьпечыць шы агульную плошчу пасеву на гэтых зямельных участках у разьмерах, вызначаных па пляну пасеву канапель;

в) забясьпечыць з вясны 1933 году пераход ільнаводных калгасаў на правільны севазварот, максымальна скарыстоўваючы наяўнае па БССР насеньне канюшыны для забясьпячэньня гэтых калгасаў;

г) зрабіць да 1-га жніўня 1933 году поўны рамонт усіх мачыльных ям, сушыляў, сушыльна - мялных і трапальных пунктаў для лёну і канапель; канова пабудаваць у калгасах да 1-IX—33 г. 34 мачыльных ямы для лёну і 20 буйных мачыльных ям для пянькі і 150 палепшаных сушылак з памяшканьнямі пры іх для мяцьця і тропкі лёну і пянькі;

9. Абавязаць Беллёнатрактарацэнтр і Белсельгасснаб забясьпечыць завоз у асноўныя ільнаводныя раёны шырока-захватных лёнасерабілкі, лёначысьцілелі, лёна - трыеры, ільняных і канаплянных малатарні і шасьціпарвальных мялкі для лёну і пянькі.

10. Прапанаваць Беллёнаканаплябуду і Белтрактарацэнтру забясьпечыць неабходнымі сродкамі і абсталяваньнем будуючыяся лёна-заводы і разьлікам сканчэньня будаўніцтва іх да 1 верасьня 1933 году з тым, каб з 1 кастрычніка 1933 г. працавала-б па БССР ня менш 70 лёназаводаў.

11. Даручыць УпаўнаркамСНК т. Бэнэку і Наркамзему т. Рачыцкаму зацьвердзіць плян водпуску насеньня лёну і канапель па раёнах і ўстанавіць парадак водпуску яго, прадугледзеўшы першачарговы водпуск калгасам.

12. Адпусьціць для выдачы (продажу) здатчыкам лёну і пянькі ўраджаю 1933 г. 18.250 тон хлеба.

З агульнай колькасьці хлеба для стымуляваньня пасеву і загатовак лёну і канапель адпусьціць вясной у часе сяўбы і праполкі 3000 тон. Даручыць УпакамзагСНК устанавіць раёны, нормы і парадак водпуску хлеба пасеўшчыкам і здатчыкам лёну і канапель у прамой залежнасьці ад якасьці здаваемай прадукцыі, прадугледзеўшы норму выдачы калгасам, якія абслугоўваюцца МТС у сярэднім на 10 пр. вышэй норм, устаноўленых для калгасаў, якія не абслугоўваюцца МТС.

Устанавіць, што хлеб, які атрымліваецца калгасам ў парадку стымуляваньня пасеву і загатоўкі лёну і пянькі, разьмяркоўваецца выключна паміж калгасьнікамі, якія фактычна працавалі па пасеву, праполцы, уборцы і апрацоўцы лёну і канапель.

13. Абавязаць Белкаапсаюз і Упаўнаважанага Камітэту Таварных Фондаў забясьпечыць своячасовае атрыманьне фондаў прамтавараў, якія вылучаюцца для стымуляваньня пасеву і загатоўкі лёну і пянькі, мэтавы завоз і выдаткаваньне гэтых тавараў, прыцягваючы да адказнасьці вінаватых у скарыстаньні гэтых тавараў не па прамому назначэньню.

14. Устанавіць выдачу (продаж) расьлінага алею і макухі здатчыкам насеньня лёну і канапель за кожны здадзены цэнтнэр насеньня па наступных нормах:

а) для калгасаў, якія абслугоўваюцца МТС—3,5 кгр алею і 5 кгр макухі;

б) для калгасаў, якія не абслугоўваюцца МТС—3,2 кгр алею і 4,5 кгр макухі;

в) для аднаасобных бядняцка - серадняцкіх гаспадарак—2,5 кгр алею і 4 кгр макухі;

г) для насеннаводных калгасаў і здатчыкаў селекцыйнага і гатункова га насеньня—6 кгр алею і 7 кгр макухі. Выдачу алею і макухі рабіць на 50 проц. у часе здачы насеньня і 50 проц. у 1 кв. 1934 г.

15. Даць у 1933 годзе калгасам і аднаасобным бядняцка - серадняцкім гаспадаркам, якія сеюць лён і канапелю, наступныя ільготы:

а) усе пасевы лёну па канюшыне і цалине, узаранай з восені, а таксама ўсе пасевы канапель у раёнах, згодна асобнага сьпісу, зацьверджанага СНК БССР, поўнасьцю вызваляюцца ад сельска - гаспадарчага падатку;

б) пасевы лёну і канапель падлягаюць бясплатнаму акладному страхаваньню ад засухі;

в) увесь ураджай плоскані выбраных калгасамі, калгасьнікамі і аднаасобнікамі, не кантрактуецца і пасту пае ў поўнае распараджэньне калгасаў і аднаасобных бядняцка - серадняцкіх гаспадарак.

16. СНК БССР і ЦК КП(б)Б асобна адзначаюць, што выкананьне кожным кантрактантам узятых на сябе дагаворных абавязацельстваў па пасеву, праполцы, добрай уборцы і своячасовай здачы прадукцыі лёну і канапель дзяржаве вызяўляецца важнейшым абавязкам кожнага калгасу і кожнага працоўнага аднаасобніка.

Толькі пасьля выкананьня дзяржаўнага пляну здачы лёну і канапель калгас мае права бесьперашкодна распараджацца той часткай прадукцыі, якая застаецца ў яго карыстаньні, як для патрэб калгасу, так і для патрэб калгасьнікаў.

Задача савецкіх і партыйных арганаў БССР заключаецца ў тым, каб у 1933 г. дабіцца самай суровай дысцыпліны ў справе выкананьня кантрактантамі сваіх абавязацельстваў, як па колькасьці і па якасьці здаваемай прадукцыі, так і па тэрмінах здачы.

СНК БССР і ЦК КП(б)Б абавязваюць мясцовыя савецкія і партыйныя органы весьці самую жорсткую барацьбу з нядобрасумленнымі кантрактантамі, якія ашукваюць дзяржаву і мэтай атрымаць хлеб, насеньне і іншыя ільготы шляхам фіктыўнай кантрактацыі, дрэннай апрацоўкі глебы, несвая часовай праполкай, псаваньнем лёну і канапель у выніку дрэннага расьцілу ці моўкі і нядобраякаснай апрацоўкай.

СНК БССР і ЦК КП(б)Б абавязваюць мясцовыя савецкія і партыйныя органы і загатоўчыя арганізацыі да нядобрасумленных кантрактантаў ужываць жорсткія меры спагнаньня, пазбаўляючы іх ільгот, якія прадаставілены гэтай пастановай для акуратных здатчыкаў лёну і канапель, не спыняючыся перад жорсткімі рэпрэсіямі да тых, якія злосна зрываюць выкананьне сваіх абавязацельстваў, прынятых кантрактацыйнымі дагаворамі.

Адначасова з гэтым СНК БССР і ЦК КП(б)Б абавязваюць Бел. К-ру Загатлёну, Белкаапсаюз, РВК і РК КП(б)Б забясьпечыць поўнасьцю для акуратных здатчыкаў лёну і канапель усе ільготы, якія ўстаноўлены гэтай пастановай.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**

Сакратар ЦК КП(б)Б **М. Гікало.**

12 сакавіка 1933 г.

Ніякай літасьці да кулакоў, забойцаў коняй

Гаспадарка Пінчука Андрэя «серадняцкая». Ён меў усяго толькі 15 га зямлі. Праўда, у дадатак арандаваў спачатку 10 га, а пасьля 20 га. Гэту зямлю ён аддаваў на часткі. Ваколічная беднота апрацоўвала і абсявала сваім насеньнем на трэці сноп. Пры падзеле Пінчук заўсёды выбіраў лепшае збожжа.

У год вялікага пералому—(1929 г.) бядняцка - серадняцкая частка вёскі Барбарава арганізавала калгас. Ня будзем затрымліваць чытача на тых фактах клясавай барацьбы, якая разгортвалася вакол арганізацыі калгасу; адзначым, толькі, што бядняцка - серадняцкая частка вёскі перамагла. Калгас арганізаваўся.

Казючыц таксама «серадняк», меў усяго «толькі» 57 га зямлі і 3 сям'і пастаянных парабкоў. Эксплёатаваў піў кроў, выцягваў жылы ня толькі з дарослых парабкоў, але і з дзяцей. Работы хапала ўсім: пасьвілі 25 галоў буйнай рагатай жывёлы, капу авечак, сьвіней, гусей і г. д. Што і гаварыць, умеў прыціснуць парабкоў так, што баяліся пісьнуць. А сваіх дзяцей вучыў... У 1929 г. гэтага крывасмока раскулачылі. Сын Васіль экспромтам «аддзяліўся» ад бацькі, бо бацька, бачыце, «быў дэспат, зьвер, а не чалавек» (словы сына). Бацьку выслалі, а сын Васіль астаўся, як «серадняк».

Лабавая атака супроць калгаснага руху пацярпела крах. Бядняцка - серадняцкая частка вёскі цьвёрда ступіла на калгасны, сацыялістычны шлях. Беднякі і сераднякі зразумелі, што рабочая кляса і яе авангард — кампартыя указваюць і вядуць па адзіна - правільным шляху, па шляху сацыялістычнай перабудовы вёскі; што калгас дасьць ім дабрабыт і магчымасьць назаўсёды разьлічыцца з кулацкай кабалой. Што-ж робяць Казючыцы, Пінчукі і іх хэўра?

Яны спайваюць частку беднаты і сераднякоў, угаварваюць іх не пярэчыць, а падтрымаць на сходзе, калі будзе разглядацца іх заява аб уступленьні ў калгас. Аднаго падпаілі, другому пагразілі, трэцяга падкупілі і такім чынам пралезьлі ў калгас. Да гэтай справы прылажыў сваю руку і былы загадчык Райземчасткі Шамко. Такім чынам кулакі пралезьлі ў калгас.

Крыху замацаваўшыся ў калгасе, Пінчук і Казючыц пачалі арганізоўваць вакол сябе групу аднамысьнікаў. Калі гэта група ўмацавалася, а Пінчук з Казючыцам грунтоўна акапаліся,—тады пачала кулацкая групоўка арудаваць.

Пінчук А. пралазіць у старшыні калгасу, а Казючыц робіцца рахункаводам. Свайго чалавека зрабілі ключнікам—і «ўсё у парадку». Казючыц лепшы сябра Шамко, ён яго падтрымлівае. Казючыца зрабілі ўдарнікам. Шамко прапануе Казючыцу зрабіцца інструктарам Райза. Знайшліся сябры ў Казючыца і расьпісалі ў Райгазэце «Камуніст» (Бабруйск), што Казючыц дае «прыклад, як трэба працаваць у калгасе». Казючыца прэміруюць—Казючыц бярэ, ў свае рукі рэдагаваньне насьценгазэты і выкарыстоўвае гэтую астрэйшую зброю змаганьня ў сваіх мэтах. Маскіроўка, як бачыце, ня дрэнная. Паспрабуй, скажы цяпер што - небудзь кулагасьнік бядняк-серадняк супроць Казючыца. Праўда, лепшая частка калгасьнікаў беднаты і сераднякоў не маўчала, змагалася, але групоўка Пінчука - Казючыца была мацнейшай. Лепшая частка калгасьнікаў ня мела дапамогі і падтрыманьня ад мясцовай партыйнай арганізацыі. Людзі з партбілетамі ў кішэні былі на баку кулака, ігралі ў адну дудку з Пінчуком - Казючыцам. Але аб гэтым ніжэй.

З першых дзён уступленьня ў калгас Пінчук і Казючыц плянамерна разьвівалі шкодніцкую контр - рэвалюцыйную работу. Пінчук як шалёны накінуўся на коняй. Маладога 4-гадовага каня ён каменем тоўк па галаве, і конь на другі дзень здох.

Аб прыцягненьні Пінчука да адказнасьці ня было гутаркі. Прылажыў сваю руку Пінчук і да сьвіной фэрмы. Ёсьць «заслугі» і ў падрыве малочнай фэрмы. Гэты кулак пралез у партыю (кандыдат з 1932 г.) для таго, каб больш маскіраваць сваю контррэвалюцыйную работу.

Казючыц «прадаваў» мэтадамі Пінчука. Раз ударыў жарэбную кабылу каменем па жываце. Кабыла скінула жарабё, а сама здохла. У самы разгар жніва 1932 г. Казючыц «выпадкова» зачапіўся жняяркай за камень і паламаў яе ўшчэнт.

Цікава, што Шамко, быўшы загадчык Бабруйскага Райза, кіраваў Казючыцам - Пінчуком і старанна даказваў у раёне, што гэты калгас перадавы, «адзін з лепшых». Для таго, каб зрабіць яго «перадавым», у вясеньнюю пасеўкампанію 1932 г. Шамко на вучыў Казючыца — Пінчука зрабіць так: бліжэйшыя ўчасткі каля дарогі пасеяць як мага хутчэй і рапартаваць, і пасьля «па меры магчымасьці» засеяць рэшту. Казючыц з Пінчуком так і зрабілі. Рапартавалі, што засеялі поўнасьцю на 100 проц., а ў сапраўднасьці было засеяна ня больш па палавіны. За такую «прыкладную работу» Пінчука і Казючыца Райза прэміравала.

Для кулака Казючыца Пінчук пера вёз хату. Перавозка і поўнае абсталяваньне кватэры Казючыца зроблена за калгасныя грошы. Плацілі працаднямі і грашыма. Наогул, кулацкая група рабіла, што хацела, бо ў іх руках былі камандныя высоты гаспадаркі калгасу.

Разваліць канчаткова калгас—такая задача кулацкай групы. Але лепшая частка калгасьнікаў беднаты і сераднякоў усімі сіламі падтрымлівалі калгасную гаспадарку. Яны і ня далі дабіць калгас, ня далі разбазарыць на сенфонды. Вялікую ролю адыграў закон ад 7 жніўня 1932 г. Кулак хутка зьнюхаў, што «сацыялістычная грамадзкасьць сьвяшчэнна і недатыкальна». Ён зьмяніў тактыку.

Забіваць коняй адкрыта—гэта значыць падстаўляць сваю галаву пад удар. А кулак шануе сваю галаву. Ён дзействуе ціпком. Раней замучылі, а пасьля заразілі вашыма. І цяпер 30 коняй—уся цягавая сіла,—фактычна выведзена з строю. Кулак ведае, што конская паталоґ'е, цягавая сіла—адзін з рашаючых фактараў пасьпяховага правядзеньня веснавой сяўбы.

Пры дапамозе брыгадзіра РК КП(б)Б тав. Багдановіча лепшая частка калгасьнікаў павяла рашучую барацьбу з кулацкай групоўкай. Пінчука і Казючыца 7-III выкінулі з калгасу. Сёньня пераглядзелі склад конюхаў, узмацнілі догляд за коньмі, як і за ўсёй жывёлай, закупілі лякарства і пачалі лячыць коняй. Ёсьць надзея, што да веснавой сяўбы коні будуць здаровымі, працаздольнымі. Ачышчэньне калгасаў ад кулацкіх элемэнтаў толькі разгортваецца. Калгасному актыву яшчэ многа трэба папрацаваць, каб зрабіць арганізм калгаса зусім здаровым. Калгасьнікі спадзяюцца, што справай шкодніцкаў—кулакоў займуцца адпаведныя органы і ачысьцяць тэрыторыю калгасу ад клясавых ворагаў.

Калгас імя Вароўскага, Бабруйскага раёну, мае ўсе падставы да бурнага росту. Ён ачышчаецца ад кулацкага элемэнту, зьнішчае абязьлічку, уводзіць зьдзельшчыну. Калгас мае добры будынак, сьвінную і малочную фэрмы. Патрэбна толькі бальшавіцкае кіраўніцтва, і тады можна з упэўненасьцю сказаць, што калгас будзе адзін з лепшых на Бабруйшчыне.

Бюро ячэйкі не стаяла і цяпер не стаіць на чале барацьбы калгасьнікаў-ударнікаў з кулацтвам, якое аказалася ў радзе калгасаў («Гігант», «Чырвоная кветка» і інш.). Больш таго, члены бюро бралі кулакоў пад сваю абарону, мікнуліся абяліць Пінчука, як «палітычна няпісьменнага». Пінчук на бюро абараняе Казючыца, а т. Эльясін (дырэктар саўгасу імя ЛЕНІНА), член бюро, абараняе Пінчука. А сакратар ячэйкі т. Лапіцкі нават настойвае аб зістаўленьні Пінчука ў партыі.

І толькі на другім паседжаньні бюро ячэйкі у прысутнасьці ўпаўнаважанага ЦК КП(б)Б і брыгадзіра РК КП(б)Б Лапіцкі згадзіцца выключыць Пінчука з радоў партыі.

За сьпіной «партыйцаў» кулак доўгі час праводзіў сваю контррэвалюцыйную работу. Бабруйскі РК КП(б)Б пазнен зашкавіцца работай ячэйкі Сыч каўскага сельсавету і ачысьціць свае рады ад клясава-варожых пераражэнцаў, бо з такімі «камуністамі» у бой ісьці нельга.

Л. ГАК.

„Справядлівую праўду сказаў пра нас т. Сталін“

Сход гэты быў у калгасе імя КАРЛА МАРКСА. На сход сабраліся калгасьнікі і нават аднаасобнікі. Сабраліся паслухаць дэлегата ўсесаюзнага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў т. КАРОЛЬ АЛЕНУ. Адкрылі сход, далі слова Алене.

— Я ўжо пражыла больш за 30 год, —гаворыць Алена,—але ніколі так ня было. Таварышы, я ніколі ня думала, што мне прыдзецца вось разам з вамі выконваць такую адказную работу. Я гаварыць добра ня ўмею, але тут, перад вамі раскажу, як магу, што я бачыла.

Перш за ўсё, раскажу як нас спаткалі ў чырвонай сталіцы. Сустрэлі нас рабочыя Масквы—лепшыя ўдарнікі. Пасадзілі ў аўтамабілі, павезьлі ў дом калгасьніка. Цёпла, чыста і ўтульна там. Назаўтра, пасьля абеду, разам з рабочымі-ударнікамі мы паехалі на зьезд. Я не магла апомніцца, дзе я знаходжуся—такі рух, столькі людзей.

Зьезд адкрыў т. КАГАНОВІЧ, які расказаў, куды расходуе наша дзяржава грошы, расказаў пра нашы посьпехі. А яшчэ т. КАГАНОВІЧ расказаў пра другую пяцігодку, пра тыя задачы, якія стаяць зараз перад намі. У прэзыдыуме бачыла ўсіх правадыроў. Быў там наш т. СТАЛІН, т. ВАРАШЫЛАЎ, былі т.т. КАЛІНІН, МОЛАТАЎ—усе былі, быў і камсамольскі сакратар т. КОСАРАЎ.

Пасьля дакладу артысты чырвонай сталіцы нам паказалі ўсякія прадстаўленьні.

Назаўтра зьезд адкрыўся а 11 гадзіны раніцы. Шмат тут выказвалася пра галоўнае, як падняць ураджайнасьць. Гаварылі аб калгасным жыцьці, аб кулаках, якія шкодзяць сацыялістычнаму будаўніцтву. Пра вясну гаварылі, пра работу вытворчых калгасных брыгад, пра коняй, пра жывёлагадоўлю. Пра ўсё гаварылі.

— А яшчэ забылася сказаць пра цялят. Цялят трэба даглядаць так: аба вязкова перагарадзіць хлявы, пабудаваць кармушкі, каб захаваць корм. Даглядчыцы павінны атрымоўваць працадні ня проста за догляд; лік працадзён павінен залежыць ад прыросту цялят. Тады работніцы будуць зацікаўлены ў сваёй рабоце. Тады ў нас будзе парадак, будуць добра расьці цяляты. А ня так, як у нас. У нас яшчэ дрэнны догляд за цялятамі; і холадна, асобных цялятнікаў няма. А на цялят, на кароў мы павінны зьвярнуць галоўную ўвагу, бо наш калгас мае жывёлагадоўчы ўхіл. Тое самае пра сьвіней.

Мы, таварышы, былі на экскурсіі на заводы хадзілі. Каб мы так, таварышы, працавалі, як працуюць на аўтамабільным заводзе рабочыя, усё добра было-б. Там выконваюць і перавыконваюць нормы. Там парадак, дысцыпліна. Выпускаюць 70 аўтамабіляў за дзень. З аднаго канца гэтак пачнецца работа—з другога боку выходзіць аўтамабіль, рабочы садзіцца і ўжо адяжджае, аж дзіўна нават стане віца; ніколі я гэтага ня бачыла.

Яшчэ магу сказаць вось аб чым. Былі мы ў маўзалеі Леніна. Ён зараз ляжыць там. Зусім просты чалавек, ня так мы яго уяўлялі: вялікага надзвычайна. А ён-жа тварыў такія вялікія справы, ён стварыў нам лепшае жыцьцё.

Выступаў з прамовай і тав. СТАЛІН. Праўду казаў ён, справядліва гаварыў. Пра ўсіх нас ён ведае. Гаварыў аб жыцьці ў калгасе. Усё як ёсьць, справядлівую праўду сказаў т. СТАЛІН. Калгас нам даў многа. Вось я вазьму хоць-бы сябе. Раней я была батрачкаю, працавала на кулакоў, чаму вось і зараз гуз на руцэ (Алена паказала на руку). Толькі ў калгасе ён пачаў сыходзіць. Хоць я многа і ў калгасе працую, але тут зусім ня тое, што ў батракох. Аднаасобніцай я не магла дагледзець па-людзку і аднаго дзіцяці, зараз-жа ў мяне трое, і ўсе апранутыя, сыты, абутыя.

Казаў т. СТАЛІН, каб мы, калгасьнікі, сталі заможнікамі, не аднаасобнікамі заможнікамі, а калгасьнікамі. Я скажу, што наш калгас ужо заможны, у нас ужо ёсьць калгасьнікі заможнікі. Вазьміце вы нашага калгасьніка тав. Дудара Дзям'яна, ён жа вечны батрак, цяпер заможнік калгасьнік. Дудар атрымаў 210 пуд. збожжа, 150 пудоў бульбы і 1.400 руб. чыстымі грашыма.

Возьмем Кунтыша Івана. Іх чатырох у сям'і—двое дзяцей і яны удваіх працаздольныя. Выпрацавалі 887 працадзён, атрымалі 133 пуды збожжа, 277 пуд. бульбы, 887 руб. грашыма. Ёсьць у нас ужо многа такіх калгасьнікаў. А заможнікам можа ў калгасе быць кожны батрак, бядняк, серадняк, але ня лодыр, ня сымулянт, як напрыклад, Серада Кастусь; яны толькі ўдваіх жывуць, абое працаздольныя, а выпрацавалі толькі 272 працадні. Або сям'я Рака Сьцяпана—мае 294 працадні, у той час, калі магла мець 800 працадзён. Зрыўшчыца і і Лабан Мар'я, якая выпрацавала толькі 93 працадні.

— Значыць, мы павінны зараз весьці барацьбу з тымі, хто ня хоча рабіць калгасьнікам-заможнікам, і разам з гэтым рашуча ачышчацца ад заможнікаў-эксплёататараў, кулакоў, варожых людзей, якія яшчэ і зараз думаюць нас разбурыць. Дарэмныя іх мары—так і гаварыў т. Сталін. Мы павінны прыглядзецца яшчэ пільней да ўсіх нашых калгасьнікаў, каб выявіць і зьнішчыць новых ворагаў.

— Многа атрымала я ад зьезду. Я атрымала столькі сілы, энэргіі,—здаецца, каб магла, дык адразу-б зьнішчыла ўсе недахопы ня толькі ў нашым калгасе, але і ў вакольных калгасах. Вось і усё, што магу сказаць пра зьезд.

— А зараз выклікаю ўсіх жанчын-калгасьніц, а таксама калгасьнікаў-мужчын на сацыялістычнае спаборніцтва. Я ад іх нідзе не адстану!

Алену падтрымалі гучнымі воплескамі.

У спрэчках выказваліся Чарняк—кавёлавод, Герасімовіч—брыгадзір палявод, Кунтыш—былы батрак, партызан, калгасьнік-ударнік. Усе гаварылі аб росьце свайго калгасу, аб недахопах, аб падняцьці ўраджайнасьці, аб барацьбе з прагульшчыкамі, злодзеямі-раскрадальнікамі калгаснай маёмасьці; гаварылі аб поўнай самаачыстцы ад кулакоў і варожых элемэнтаў.

Кароткая, ясная, канкрэтная пастанова была прынята на гэтым сходзе Агульны сход калгасьнікаў калгасу «Карла Маркса» са здавальненьнем прыняў заклік Ўсесаюзнага зьезду калгасьнікаў. Калгас прыняў выклік на сацыялістычнае спаборніцтва калгасу «Першае Мая» на найлепшае падрыхтоўку і правядзеньне весняводзкай сяўбы. Тут-жа абраны на раённы зьлёт калгасьнікаў-ударнікаў—лепшыя ударнікі калгасу. Абралі Герасімовіча Казіміра і Броцька Ціту, якія павінны рапартаваць зьлёту аб сваіх перамогах.

А. ПЯЛІНСКІ.

Правальваюць засыпку насеньнфондаў

Лепель. Становішча з засыпкай насенных і страхавых фондаў у калгасах Лепельскага раёну неадвальняючае. Паасобныя сельсаветы ганебна адстаюць у справе засыпкі насенных фондаў. Так, Весялоўскі сельсавет выканаў толькі 54 проц. пляну засыпкі насеньня збожжавых культур. і 19 проц. тэхнічных.

Яшчэ больш адстаў з засыпкай насеньня тэхкультур Валоскаўскі сельсавет (12 проц. пляну). Недалёка ад Валосаўскага адышоў і Прудоцкі сельсавет, які выканаў толькі 18 проц. пляну засыпкі насеньня тэхкультур.

Агульны процант засыпкі насеньня тэхкультур па раёне не дасягае і 50 проц. пляну. Назіраецца шкодная тэндэнцыя папоўніць недахоп насеньня тэхкультур насеньнем іншых культур.

Зусім дрэнна абстаіць справа з засыпкай страхавых фондаў. Па збожжавых засыпана страхфондаў 88 проц. па тэхкультурах—24 проц., па бульбе —59 проц. Паасобныя сельсаветы яўна правальваюць засыпку страхавых фондаў.

Да пачатку сяўбы астаўся лічаныя дні. Неабходна ў самы бліжэйшы час дабіцца рашучага зруху ў справе засыпкі насенных і страхавых фондаў, дамагчыся таго, каб ўсё васпанае на сеньне было неадкладна пратручана і ачышчана.

Міхась Бягун.

П. Шастакоў

Самы страшны вораг

(З цыклю „ЗАЛАТОЕ ДНО“)

Ваўкі „пужаюць“ людзей

Напорным жалезным крокам праца пракладвае сабе шлях... Зьмяняецца ляндшафт, кладуцца новыя фарбы, вынікаюць і растуць новыя гукі. Дзіч і немярэч, балота, пустыньня, бязьлюдныя, пясчаныя лясы зьмяняюць нават свой рэльеф, пертвараюцца ў плядцарм упартых баёў чалавека суп роць чалавека, чалавека супроць прыроды.

Калі чалавек наважыў перамагчы, ён узбройваецца непахісным воляй да перамогі, ён выведвае і вывучае сілы ворага, ён бязьлітасна «выводзіць у расход» сілы, якія дзействуюць супроць, ён будуе такі «паралелаграм сіл», які забясьпечвае пераможны рух уперад...

Усё гэта аксіёмы, але іх ніколі ня лішне паўтараць...

... Нібы тры ґіганцкія рукі, якія галасуюць за перамогу над прыродай і чалавекам, — рашуча ўзьмятнуліся ўгару тры сілосныя вежы. Гэта вызаў прыродзе, гэта ўльтыматум балоту і пяскам.

— Даёш кармовую базу!

Больш канкрэтна:

— На тысячу галоў буйнай рагатай жывёлы вы будзеце прымушаны даць смачных, сакавітых, добрых кармоў.

Прайшлі часы шуканьня прытулку ў в. Суціна — хат для людзей, пуняў для жывёлы. Стройна выцягнуліся чатыры двары малочнай фэрмы. Цэлы рабочы пасёлак з перавезеных кулацкіх хат вырас на водшыбе ад фэрмы. Два новых прыгожых дамы аздобілі сядзібу саўгасу «Залог пяцігодкі».

Пульс новага жыцьця, якое нарадзілася сярод пяскоў і балот тропку больш двух гадоў таму назад, адчуваецца выразна...

Пад новаю доўгаю паветкаю стаяць гатовыя на штурм балота пяць «Інтэраў» і адзін «Фардзон».

Часта і мерна пыхкае рухавік вадакачкі...

Пушча каравых куп'істых хмызьнякоў адсунулася ад жылых і надворных будынкаў сядзібы.

Акопы — канавы ляглі на балоце. Чалавек наступае напружанай працай, адваёўваючы кожны гектар балота. Прырода з неахвотай здае пазыцыі...

Ноччу, калі ў вокнах будынкаў патухаюць ветлівыя агні, у балоце выюць ваўкі. На нудны, поўны роспачы, воўчы плач трывожна адгукаюцца суцінскія сабакі.

Ваўкі трымаюць сябе як вартаўнікі балота, як казачныя чараўнікі і духі, якім прырода даручыла абараняць «залатое дно» ад людзей, як балотныя разьведчыкі людзкіх спраў і намераў.

У зімнія ночы яны падыходзяць блізка да будынкаў саўгасу і чырвонымі агеньчыкамі палахлівых і драпежных вачэй пазіраюць на цёмныя сілуэты сілосных вежаў, на асьветленыя вокны жыльля, чула прыслухоўваюцца да ўсякіх гукаў, прагна ловяць пах гною і кароўяга поту, ляскаюць зубамі...

Іншы раз і сярод белага дня шэрыя вартаўнікі балота выходзяць на разьведку. На вачох людзей яны праходзяць не сьпяшаючыся блізка ля будынкаў, нібы з намерам паказаць, што прырода яшчэ моцна трымае свае пазыцыі, што шлях да «залатога дна» ня скора здадуць шэрыя драпежнікі, што «залатое дно» замкнута чароўным ключом тайны пад няўпынаты шорах асакі, пад дзікія незразумелыя воўчыя прычытаньні...

І ўсё-ж такі балота адступае і воўчае выцьцё — гэта дзікі безнадзейны плач прыроды, на якую сьмелая рука чалавечая накладае ўзду, каб прыму сіць гэту запаведную глуш і дзіч балота адчыніць свае багацьці чалавеку...

Ваўкі «пужаюць», але яны самі баяцца людзей...

Бацылы Банга страшней за ваўкоў

«... Маленькая, нярухомая палачка, якая не ўтварае спор. Часам мае на канцы колбападобнае патаўшчэньне. Лёгка фарбуецца звычайнымі аніліновымі фарбамі. Часта афарбоўка бывае нероўнамернаю, наглядаюцца сьветлыя прамежкі, з прычыны чаго некаторыя бацылы здаюцца дыплёкокамі ці кароткімі стрэптакокамі. Па Граму не фарбуюцца. Н апажыву бацылы не пераборлівыя...»

Так апісвае гэтага «зьвера» прафэсар агульнай эпізоотаалёгіі, дырэктар вэтэрынарна - гігіенічнага інстытуту Лейпцыгскага ўнівэрсытэту Мартын Кліммэр.

Бацыла носіць імя Банга, які быў яе вынаходцай...

Ды ў сутнасьці ня ў гэтым справа! Справа ў тым, што бацыла не разьбіраецца ў харчовых сродках і, ня гледзячы на свой мікраскапічна - мізэрны рост вельмі жыцьцяздольная. А самае галоўнае, што сваю шкодніцкую дзейнасьць гэта мразь накіравала на зьнішчэньне прыплоду кароў, кабыл, сьвіней, авечак, выклікаючы ў іх аборт. Гэты шкоднік варваўся і ў саўгас «Залог пяцігодкі».

Вось вынік яго «дзейнасьці».

У мінулым годзе ў саўгасе было чатыры выпадкі інфэкцыйнага аборту, а сёлета лябараторны досьлед крыві кароў даў сто дваццаць выпадкаў станоўчай рэакцыі. Гэта значыць 20—25 проц. усяго малочнага стада хварэе на інфэкцыйны аборт і замест ста дваццаці жывых здаровых цялят будзе прынесена сто дваццаць выкідышаў.

Якія страты наносіць гаспадарцы бацыла Банга?

Пашукаем адказу на гэта пытаньне ў таго-ж Лейпцыгскага прафэсара Мартына Кліммэра.

«Страты, якія прыносіць інфэкцыйны аборт, складаюцца з сум убыткаў ад цялят, (цяляты часта раджаюцца мёртвымі, мала або зусім няжыцьцяздольнымі) і ад малака (пры звычайных выпадках аборту на 5—7 месяцы страта малака складае $^1/_4$ да $^2/_5$ гадавога ўдою). Да гэтага трэба дадаць, што ў многіх кароў з прычыны інфэкцыі затрымліваецца посьлед, што ў сваю чаргу зьяўляецца прычынай гніласнага запаленьня родавых каналаў, піямэтрыту, бесплодзьдзя, зьнясіленьня, а ў далейшым страты мала ка

З трыбуны раённых зьлётаў

Ільянкоў П.

Ударнік—брыгадзір калгасу імя Карла Маркса (Магілеўшчына)

Падзялюся вопытам сваёй работы

Паведамленьне аб тым, што наш калгас будзе прымаць удзел у раённым зьлёце калгасьнікаў-ударнікаў вельмі ўсьцешыла мяне, як брыгадзіра. Гэта права мы заслужылі. Я, як брыгадзір, хачу падзяліцца вопытам работы нашага калгасу ў барацьбе за пасьпяховую падрыхтоўку да сяўбы.

Наш калгас да сяўбы ў асноўным гатоў. На сёньняшні дзень поўнасьцю засыпаны насеньні і страхавы фонды.

Поўнасьцю забясьпечыць калгас насеньнем мы змаглі таму, што на гэту справу былі мабілізаваны ўсе калгасьнікі. Ім было шырока растлумачана, што той калгас будзе зьяўляцца моцным удзельным пасьпяхова выконваць пастанову партыі і ўраду, які сваяча сова выканае абавязкі перад дзяржавай, засыпе насенныя і страхавыя фонды і толькі потым будзе разьмяркоўваць прыбытак.

Мы ня так зрабілі, як наш суседні калгас «Чырвоны партызан». Ён раней разьмяркаваў прыбыткі, хваліўся, што калгасьнік шмат атрымаў, а ў выніку вышла, што цяпер у іх справа з насеньнем вельмі дрэнная.

Вось чаму мы поўнасьцю выканалі абавязкі перад дзяржавай, засыпалі насеньні і страхавы фонды і пасьля гэтага правільна па працаднёх разьмеркавалі прыбыткі.

Праводзячы работу па засыпцы на сеньных і страхавых фондаў, мы адначасова рыхтавалі для сяўбы сельскагаспадарчы інвэнтар і машыны. Ва ўсёй падрыхтоўцы мы шырока ўжывалі сацыялістычныя мэтады працы—сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Наш калгас заключыў сацыялістычную ўмову на сацспаборніцтва з калгасам «Парыская камуна». Штодзённая праверка выкананьня ўзятых абавязацельстваў нам забясьпечыла пасьпяховае выкананьня раду падрыхтоўчых работ. Возьмем, напрыклад, рамонт сельска-гаспадарчага інвэнтару і машын. У дагаворы рамонт трэба скончыць да 25 лютага. Да гэтага часу ўвесь інвэнтар быў у поўнай гатоўнасьці, эмазаны і захаваны. Калгас мае спраўнага інвэнтару: плугоў адналямешных 27, барон «зігзаг» 12, барон простых —25, акучнікаў—14, калёс адзіночных —25 парных—16, хамутоў рабочых—37. Пастромкі, вілкі, вяроўкі таксама маюцца ў вялікай колькасьці.

Гэтых посьпехаў мы дабіліся яшчэ і таму, што ўсе пастановы партыі і ўраду былі шырока распрацаваны сярод калгасьнікаў. У нас на зборы прыйшлі арганізаваны гурток палітвучобы (ім ахоплена 50 чалавек), на якім мы шырока распрацавалі рашэньні пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б), даклад тав. Якаўлева, прамову тав. Сталіна і зварот зьезду калгасьнікаў-ударнікаў.

Працадысцыпліна ў нашым калгасе стаіць цяпер на належнай вышыні таму, што мы ў штодзённай рабоце вялі бязьлітасную барацьбу з прагулышчыкамі, сымулянтамі. Мы за апошні час па калгасе ня маем амаль нівод нага выпадку адмовы калгасьнікоў ад даручанай ім работы, няма спазьненьняў на работу.

Вялікая ўвага ў штодзённай рабоце аддаецца ў нас правільнай арганізацыі працы. У нас кожны дзень ранцай зьбіраюцца ўсе калгасьнікі, робіцца пяціхвілінная нарада, брыгадзір абвяшчае, што кожнаму рабіць, абгаварваецца план работы на гэты дзень. Увечары таксама зьбіраем калгасьнікаў, якія даносяць аб недахопах у рабоце з тым, каб на другі дзень іх не дапускаць. Я лічу ня дрэнным і тое, што ў нас кожны дзень правяраецца выкананьне даной работы.

Увёўшы гэтыя мерапрыемствы ў штодзённую сваю работу, мы маем магчымасьць свачасова правяраць выкананьне ўсіх работ па калгасе і на ходу выпраўляць тыя недахопы, якія сустракаюцца на асобных участках.

Адно дрэнна, што ў нас на сёньняшні дзень не наладжан як належыць ўлік работы, але ў бліжэйшыя дні мы гэты недахоп ліквідуем.

У штодзённай сваёй рабоце па падрыхтоўцы да сяўбы цэнтральнай задачай мы паставілі перад сабой уздым ураджайнасьці нашых палёў. Каб пасьпяхова ажыцьцявіць гэту задачу, мы пры калгасе арганізавалі гурток па вывучэньню агразоатэхніку, якім ахапілі 50 чалавек. Кожны калгасьнік абавязан сабраць 50 кілё попелу. І ўжо на сёньняшні дзень гэта абавязацельства значная частка калгасьнікаў выканала; сабрана попелу 48 пудоў. Па пляну і сацумове мы намецілі на зімовы час вывезьці 90 проц. гною і тут мы маем ўжо ня дрэнныя вынікі. Вывезена 380 вазоў гною, што складае каля 70 проц. пляну. Мінэральныя ўгнаеньні ў нас захоўваюцца ў сухім і дагледжаным памяшканьні. Апрача гэтага, калгас абавязаўся засеяць звыш пляну 2 га лубіну.

Ліквідацыя абязьлічкі ў догляде за коньмі, увядзеньне большай адказнасьці за прымацаваных коняй дае нядрэнныя вынікі. Калі ў мінулым годзе ў нас ня была ліквідавана абязьлічка ў догляде за коньмі і ня было адказнага, дык у нас было 20 проц. пацёртых коняй, а ў гэтым годзе за зімні час мы маем толькі адзін выпадак пацёртасьці і той нязначны. У нас коні разьбіты на тры групы; іх даглядаюць тры конюхі; адзін старшы і два малодшых. Старшы конюх, апрача агульнага нагляду за ўсім па галоўем, даглядае таксама 12 коняй.

Я, як дэлегат зьезду калгасьнікаў-ударнікаў і брыгадзір калгасу, запэўніваю, што аддам усе свае сілы на тое, каб ўсё насеньне, інвэнтар, збруя захаваць у добрым стане. Прыму ўсе меры да таго, каб пасьпяхова справіцца з выкананьнем цэнтральнай задачы ў сельскай гаспадарцы па ўздыму ўраджайнасьці.

Вешнякова

Дэлегатка Усесаюзнага зьезду, лепшая ўдарніца, брыгадзір калгасу „Адказ інтэрвэнтам" (Лёзьненшчына)

У калгасе дружнай арцельнай працай можна горы варочаць

Калгас наш, як тое птушанё, вельмі дзябёлую шалупайку прабіваў. Каб уявіць гэта сабе, трэба помніць, што ён арганізаваўся з якіх-небудзь 6 гас падарак. Ну і панашкодзілі нам кулакі.

Антысавецкі элемэнт, сабатажнік усіх палітычна-гаспадарчых мерапрыемстваў на вёсцы Марозаў вёў самую шалёную агітацыю супроць нашага калгасу.

З Марозавым мы ў хованкі ня гулялі. Вывелі мы гэтых агентаў на чыстую воду. А калі вораг на чыстай водзе, дык яго і за шкірку эручна ўзяць. І вось ад Марозава ў нас на населішчы толькі адна хата асталася. Мы так і зрабілі. Мы, беднякі, гэта ўжо ўмеем.

Ворагаў у нас, можна сказаць, розных масьцей і колераў хапала. Самыя неблаславенныя былі тыя, што, трымаючы партбілет у кішэні, на выслужку да клясавых ворагаў пайшлі. У нас і такія былі, як напрыклад, былы старшыня нашай гаспадаркі Архіпаў. Ён хоць і старшынёй у нас быў, але супроць нас, калгасьнікаў, і супроць усяго калгасу шоў. Рабілася гэта пацёхку, па сакрэту ад калгасьнікаў, але упарта і сыстэматычна. Зьвяваючы гаспадарчыя пляны ў калгасе, Архіпаў вёў нашу гаспадарку на звод.

Цяпер у нас другі старшыня, бо шкодніку мы не дазволілі лейцаў у сваіх руках прымаць. Вось так павёўшы барацьбу з усімі варожымі элемэнтамі, мы замацавалі свой калгас і цяпер яго яшчэ мацней цемантуем. Да вясны мы падрыхтаваліся добра. Насеньня ў нас засыпана. Думаем ў раёне паклапаціцца каб прырэзку зямлі зрабілі. Больш засеем, большая выгада дзяржаве і сабе. Коні ў нас ня дрэнна даглядаюцца. Інвэнтар адрамантаваны. Калёсы ў бліжэйшую дэкаду кончым рамантаваць. Гной вывезьлі. Хай прыходзіць вясна, мы ёй рады дамо. Гэта тое, што можна было сказаць пра калгас.

А сама я паходжу з горкіх беднякоў. Сапраўднае маё жыцьцё пачалося з 1930 г., калі я ўступіла ў калгас.

Вы яшчэ пытаецеся, за што мяне за Усесаюзны зьезд калгасьнікаў-ударнікаў выбралі. Мне так здаецца, што я нават мала чаго і зрабіла. Толькі ў часе ўборачнай кампаніі лепш за ўсіх работу ў сваёй брыгадзе арганізавала і ўборку старанна правяла. Вы конваю ўсе работы, на якіх мужчыны заняты. Я ды яшчэ ўдарніцы Калцэвіча Мар'я, Камісарава Натальля, горы варочаем: мы касілі, баранавалі, дровы рэзалі і шмат іншага чаго рабілі. На гэтых работах часьцей за ўсё мужчыны заняты, таму многія жанкі ад гэтай работы адмаўляюцца.

Мы, жаночая брыгада, яшчэ далей пайшлі. У Сутоцкім калгасе сенажаць пакінулі ня скошанай. Прапала-б шмат сена няскошаным, але мы сваёй брыгадай пайшлі на Сутоцкую сенажаць і прыбралі сена.

Вось за гэта за ўсё мяне, напэўна, і на зьезд вылучылі. А ў Маскве на зьезьдзе мяне ў прэзыдыум абралі. Зьезд многаму навучыў нас, галоўным чынам усе нашы недахопы выкрыў.

Вярнуўшыся са зьезду, я ў сваім калгасе завербавала 10 ударнікаў і арганізавала кантроль правяраць іх работу. Яны працуюць ужо так, як я.

У заключэньне я скажу, што нам трэба больш вучыцца ў рабочых, згуртавацца вакол камуністычнай партыі. У нас усё ёсьць. Нам патрэбна толькі добра працаваць. Выгнаць з нашых калгасаў клясавых ворагаў.

РУДАЯ Анюта — дэлегатка Лепшая калгасьніца калгасу «УСХОД», Сьвіслацкага сельсавету (Асіпавіцкі р-н), якая прымае актыўны ўдзел па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы.

Архіпенка Макар

Лепшы ўдарнік калгасу „Вольная праца" (Жлобіншчына)

Галоўнае—працуй добрасумленна, захоўвай калгасную дысцыпліну

— Аб сваім жыцьці пры старым ладзе хочу сказаць.

— Было цяжка, што казаць. На зямлі нельга было пражыць, усяго не хапала. Таму цягаўся па розных работах. Ад Чырвонага берагу да Лібавы ўласнымі нагамі чыгунку пераме раў не адзін раз. Мяняў шпалы, рэзаў дровы—цяжка было зарабіць на хлеб. Шмат сілы згубіў на гэтых гаргажных работах.

— Я адразу зразумеў, што да добра вядзе Савецкая ўлада, арганізоўва ючы калгасы. Калгас «Вольная праца» заснаваўся на месцы былога маёнтку. І я з сям'ёй у ліку першых уступіў у калгас. Цяжка было першыя гады нам, калгасьнікам. Коняй і насеньня не хапала. Неяк ня ўмелі разам працаваць. Нянрывычна неяк. Усе, быццам, ты другому падпарадкуешся...

Але мінуліся галоўныя цяжкасьці. Прывыклі. Навучыліся працаваць. Кожны год маем прыліў у калгас. Жыць стала вольна, радасна. Вось я выпрацаваў з жонкай 602 працадні і за гэта атрымаў 481 кілёграм жыта, 109 кілёграм пшаніцы, 66 кілёграм ячменю, 3712 кілё бульбы. Атрымаў сена, прошай. Што больш трэба мне? Двое дзяцей маіх вучыцца ў школе. Сам я працую цяпер у брыгадзе цесьляроў, будуем тыповыя хлявы для калгасу. Быў я ўжо ў калгасе і сьвінаром, і кладоўшчыком і на іншых работах пра цаваў.

— Галоўнае я прызнаў—згуртаванасьць патрэбна ў калгасе, добрая дысцыпліна. Бяз дысцыпліны нельга ў калгасе жыць.

— Працуй чэсна, добра, будзь дысцыплінаваным—і сам будзеш мець, і дзяржаве хопіць.

Іншага выхаду няма, як толькі шлях калгасны, які нам дала камуністычная партыя, савецкая ўлада».

Т. Яноўская Алена—ударніца калгасу «Усход». Яноўская праявіла вялікую ініцыятыву па зборы попелу і другіх падрыхтоўчых работ да сяўбы.

Васілеўская Арына

Ударніца калгасу „1 мая" (Бабруйшчына)

Толькі ў калгасе адчула я радасьць жыцьця

— Мне цяпер 70 год. Я з болем на сэрцы ўспамінаю тыя часы, калі я жыла ўдавою з малымі дзецьмі на аднаасобнай гаспадарцы. Якое гэта было жыцьцё? Мне і за чалавека ня лічылі.

Хлеба ніколі не хапала да новага. Панаволі прыходзілася ісьці да кулакоў Лехановічаў, Корбутаў прасіцца на работу. А хіба кулак тваю працу ацэніць? Ну і працавала за пуд бульбы па 5-6 дзён.

Ох, цяжкае было гэта жыцьцё! Ад цёмнага да цёмнага, не разьгінаючы сьпіны, працавала я. А што я мела?—Нічога! Нічога ў мяне ня было. Ня было нават каровы. Дзеці мае часта сядзелі галодныя.

Я з радасьцю ўступіла ў калгас. Я ўмею працаваць і люблю працаваць. Ня гледзячы на тое, што мне ўжо 70 год, у працы не ўступлю я маладой калгасьніцы. Мяне лічаць ударніцай і я ганаруся гэтым званьнем. Добра ведаю, што мы, ударнікі, павінны паказаць прыклад астатнім калгасьнікам сумленнай працай.

Толькі сумленная праца забясьпечыць палепшаньне дабрабыту калгасьніка і ўмацаваньне калгасу. Вось я ў мінулым годзе з сынам ў калгасе выпрацавала 525 працадзён. Працавала шчыра, не зраўніць гэту работу з добра пасеем, бо насеньне ў нас ўжо тою, якая выпадала мне на долю прыйсьці засыпана. Пазі, калёсы, збруя—маім аднаасобным жыцьці.

Тут я ведаю адно: я працую на калгас, працую на сябе. Гэта відаць і з таго, што я атрымала за мінулы год. Я маю больш 50 пудоў хлеба, звыш 200 пудоў бульбы, 350 рублёў грашыма. Ці магла я марыць аб гэтым бы зала, калі палоска мая аднаасобная, такая, такая, што бараною нельга было праехаць, калі хата мая была тры зрашыны кругом?

Цяпер я чалавекам стала. Цяпер мя не паважаюць. Цяпер я маю хлеба ўвволю, маю сваіх сьвінак, маю цялушку, жыву ў добрай калгаснай хаце.

А ўсё гэта таму, што я добра працавала, што я ўдарніца.

А ў нас ёсьць яшчэ і такія, якія на чужой працы хочуць рукі пагрэць. Гладкевіч Палашка, Гладкевіч Лізавета. Якія гэта калгасьніцы, калі яны маюць усяго па 100—120 працадзён? Лодыры яны, а не калгасьніцы. За іх сорам усяму калгасу. Не па шляху нам з імі. Або няхай працуюць, як сьлед, або ім ня месца ў калгасе. Хто не працуе, а хоча пажывіцца за кошт чужой працы таго трэба выкідаць за дзьверы калгасу.

Мы добра ведаем, што калі мы добра пасеем, дык добра і пажнем. Гэтыя словы—праўдзівыя словы. І мы ўсё спраўна. Коні нашы добрыя, маюць харчоў на ўсю сяўбу.

Паміж брыгадамі ў нас ідзе спаборніцтва на лепшую падрыхтоўку да веснавой сяўбы. Паляводная брыгада спаборнічае з возчыкамі гною. Мы добра прапрацавалі нормы выпрацоўкі, арганізавалі сталыя брыгады, рыхтуемся да пробнага выезду.

З сяўбою мы справімся. У гэтым я ўпэўнена. Спытайце ў суседзяй аднаасобнікаў, і яны скажуць, што наш калгас працуе па ўдарнаму. Яны самі перакананыся ў тым, што калгас—зьяўляецца адзічым шляхам для бедняка-серадняка. За апошні час у наш калгас запісаліся 23 новыя бядняцка-серадняцкія гаспадаркі. Яны абагулілі насеньне, коняй і разам з намі рыхтуюцца да веснавой сяўбы.

Мы вычысьцілі з калгасу клясавых ворагаў, шкоднікаў кулакоў Курсакоў і інш. Мы працуча змагаемся з лодырамі, прагульшчыкамі, змагаемся за добрасумленную працу кожнага калгасьніка і высокую якасьць гэтай працы.

Усе нашы сілы цяпер накіраваны на тое, каб добра правесьці сяўбу. Гэта нам забясьпечыць далейшае ўмацаваньне калгасу і палепшаньне свайго дабрабыту.

М. Мядзьведзеў

Лявон Баркоў прыехаў з Масквы

Мы едзем у калгас «Прыют», К. Лаўскага сельсавету. Вязе калгасьнік гэтага-ж калгасу Рубанаў Васіль.

Адразу-ж па выезьдзе з Шклову Рубакоў, павярнуўшыся да мяне, запытаў:

— Нешта гэта вы, спэцыяльна да нас?

— Хачу пацікавіцца вашым калгасам, даведацца, як вы там жывеце—кажу я.

Дзядзька Васіль, трахануўшы лейцамі, крыху падумаў, а потым аднавіў гутарку.

— Гэта праўда, што паглядзець трэба, бо ёсьць шмат чаго паглядзець. Возьмем напрыклад мяне самаго. Што я быў да калгасу? Нуль без палачкі. Ніякага здавальненьня ў жыцьці не меў. Жыў бедна, зямлі было 3 дзесяціны, была кляча, а ня конь,—з сярэдзіны зімы падымаў ужо яго на вяроўцы, бо сам ня ўставаў, нечым было карміць. Вечна сядзеў у цаўгу, спачатку пазычаў, а потым пры ходзілася адпрацоўваць.

— Зараз зусім інакш. Вось у гэтым годзе я атрымаў 65 пудоў жыта, 112 пудоў бульбы, 571 руб. грашыма і шмат іншага дабра. Гаспадарка ў нас вядзецца добра, бо працуем не ляноючыся. Працу пачынаем з усходам сонца. Лодырам ніякага спуску не даем. Наш брыгадзір Баркоў Лявон—рубам ставіў пытаньне аб падрыхтоўцы да вясны. Канкрэтна ўнёс трапанову, як трэба рыхтавацца. Тутка на сходзе вылучылі брыгады, прыцавалі да іх коняй, вупраж, інвэнтар, зямлю і людзей.

— Мне даручылі першую паляводчую брыгаду з 33 чал., 13 коняй, 11 плугоў, 26 камплектаў збруі, 5 камплектаў барон зіг-заг, участак зямлі ў 100 га. Сабраў я сваю брыгаду, рас думачыў, як будзем працаваць у час пасеўнай. Кожнаму з сваёй брыгады, да каго былі прымацаваны коні, я наказаў, каб не спадзяваўся выключна на конюха за падрыхтоўку каня да выезду ў поле, а каб сам клапаціўся аб яго становішчы, каб стараўся захаваць каня. І праўда, коні нашай брыгады знаходзяцца ў добрым становішчы, добрай укормленасьці, работы баяцца ня будуць — хоць зараз выяжджай, — са здавальненьнем пад крэсьлівае Лявон.

Т. БАРКОЎ ЛЯВОН—брыгадзір першай паляводчай брыгады калгасу «ПРЫЮТ», К.-Лаўскага с-с. Шклоўскага раёну,—дэлегат першага Ўсесаюзнага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў.

муністычнай партыі і сельскай гаспадаркі.

— Гэта-ж проста дзіва, — зьдзіўляецца ён, — такія вялікія людзі і так па простаму гавораць.

— Наогул, — кажа Баркоў,—зьезд даў мне моцную зарадку, зараз у мяне ў галаве склаўся ясны плян маёй работы і майго калгасу на далейшы час.

— Паехаў я на зьезд, калгас наш яшчэ цалкам ня быў гатоў да сяўбы. Праўда, насеньне было засыпана поўнасьцю, але засыпана не ачышчанае, рамонт інвэнтару быў зроблен толькі на 85 проц. Брыгад на гэты год створана ня было, коні, хамуты, плугі, зямля былі абязьлічаны.

— Ехаў я на зьезд і быў незадаволены ўсім гэтым. Седзячы ў вялікім тэатры ў Маскве, слухаючы даклады і спрэчкі, я, усе недахопы і дасягненьні, аб якіх гаварылі, прымяняў да свайго калгасу. Калі казалі аб недахопах,—думаў як іх зьнішчыць, калі казалі аб дасягненьнях — думаў, як іх скарыстаць у сваім калгасе. Там - жа на зьезьдзе я цьвёрда вырашыў — як толькі прыеду ў свой калгас, увесь вопыт, які я атрымаў, скарыстаю на практычнай рабоце.

— Прыехаў я ў калгас познай ночы, — гадзіны ў дзьве. Ня гледзячы на позьні час, да мяне сабраліся амаль усе калгасьнікі. «Ну расказвай пра зьезд і Маскву» — патрабуюць яны. Я ім расказаў і пра зьезд, і пра Маскву, і пра тое, як нам нашы недахопы выправіць. Амаль не да раніцы гаварыў. Праз дзень сабралі сход калгасу. Адчытаўся я перад калгасьнікамі, паставіў рубам пытаньне аб падрыхтоўцы да вясны. Канкрэтна ўнёс трапанову, як трэба рыхтавацца. Тутка на сходзе вылучылі брыгады, прыцавалі да іх коняй, вупраж, інвэнтар, зямлю і людзей.

— Мне даручылі першую паляводчую брыгаду з 33 чал., 13 коняй, 11 плугоў, 26 камплектаў збруі, 5 камплектаў барон зіг-заг, участак зямлі ў 100 га. Сабраў я сваю брыгаду, рас думачыў, як будзем працаваць у час пасеўнай. Кожнаму з сваёй брыгады, да каго былі прымацаваны коні, я наказаў, каб не спадзяваўся выключна на конюха за падрыхтоўку каня да выезду ў поле, а каб сам клапаціўся аб яго становішчы, каб стараўся захаваць каня. І праўда, коні нашай брыгады знаходзяцца ў добрым становішчы, добрай укормленасьці, работы баяцца ня будуць — хоць зараз выяжджай, — са здавальненьнем пад крэсьлівае Лявон.

— Вы толькі не падумайце, што я хлапачуся і дапамагаю выключна сваёй брыгадзе. Ты брыгадзір, ты ўдарнік — адказвай ня толькі за самаго сябе, а і за астатніх калгасьнікаў. Я і адказваю. Кожнай брыгадзе я дапамагаю, чым толькі магу. Пашоў я адной чы да брыгады, якая па ачыстцы насеньня працуе. Паглядзеў на іх работу і бачу, што сілы расстаўлены ня верна, — каля трыеру працуе 5 чалавек, у той час як каля «трыўмфу» працуе адзін. «Каля трыеру, кажуць цяжэй». І дапамог брыгадзіру, расставілі сілы — глядзіш і ачыстка пашла хутчэй.

— Наогул зьезд адкрыў мне вочы на шмат чаго новага, дапамог разьбірацца ў акружаючай абстаноўцы. Назад зьезду я выконваю. Работу свайго калгасу пастаўлю, каб веснавую сяўбу ён скончыў першым.

Лявон стукае рукой па сталу і гаворыць:

— А што гэта будзе так, я ўпэўнен.

* * *

Позьнім вечарам мы з старшынёю калгасу ЦЭНТРОЎСКІМ, брыгадзірамі-ударнікам БАРКОВЫМ і іншымі калгасьнікамі хадзілі аглядаць гаспадарку калгасу. Калгас мае 70 коняй, 33 каровы, буйную СТКФ на 77 галоў, пачалаводную пасеку, кузьню і інш.

Спачатку мы аглядзелі СТКФ. Калі мы пад'яжджалі да калгасу, дык сьвінарнік адразу кідаўся ў вочы сваімі вялізнымі разьмерамі. Тут стаіць 77 сьвінаматак, чыстата ўсюды, загарыцца хутка электрычнасьць (ужо зроблена праводка).

— Ну чым дрэнныя сьвіньні!—пытае Лявон. — Сьвіньні ў нас шаноўцца і догляд за імі надзвычайна добры.

Сьвіньні сапраўды добрыя: тлустыя, чыстыя, яны зусім не нагадваць звычайных сялянскіх сьвіней, запэцканых у гразь, худых, хутчэй пахожых на тараны, як на сьвіней.

— Амаль усе паросныя, — гаворыць БАРКОЎ.

Агледзеўшы ўсю гаспадарку калгасу, праверыўшы становішча засыпаных фондаў, мы зьвярнуліся ў праўленьне.

— Т. ЦЭНТРОЎСКІ, зьвяртаюся я да старшыні калгасу, — раскажэце мне, колькі вам сёлета трэба будзе ўсяго пасеяць і колькі засыпана насеньфонду?

— Усяго трэба нам пасеяць каля 400 га. З іх жыта трэба было пасеяць 100 га, пасеялі 110, ячменю трэба пасеяць 35 га, аўсу 110, бульбы — 50 га, лёну — 55. Насеньфонды як? Трэба засыпаць 371 цнт.; засыпалі і ачысьцілі цалкам, збожжа добраякаснае — самі бачылі.

— Ну а як у вас было ў мінулым годзе з сяўбой і ўборкай?

— У мінулым годзе? Запытайцеся ў БАРКОВА, як у нас было ў мінулым годзе. Засеяць нам трэба было 10 га ячменю, 12 аўсу, 8 бульбы і 7 га лёну. Плян невялічкі, але-ж калі ўлічыць тое становішча, якое ў нас стварылася да вясны, дык і гэты невялічкі плян цяжка было выканаць. Падбухторваемыя пралезшымі ў калгас кулакамі (зараз мы іх павычысьцілі), несьвядомыя калгасьнікі не жадалі працаваць. І толькі дзякуючы ўпартасьці, сяўбу мы закончылі ў 15 дзён. Да ўборкі рыхтаваліся загадзя — наладзілі ўвесь уборачны інвэнтар, выгналі з калгасу кулакоў, якія шкодзілі, пераканалі калгасьнікаў, што не за кулакамі трэба ісьці. Баркоў кіраваў ўсёй уборкай. Ён наладзіў работу брыгады, прымусіў працаваць лодыраў і сымулянтаў, разгарнуў сацспаборніцтва і ў выніку—ўборку закончылі ў 10 дзён, не дапусьцілі страціць ніводнае зерня. Вось таварышы, як мы працавалі ў мінулым годзе. У гэтым годзе ў нас будзе лепш. Кулакоў мы прагналі, да сяўбы падрыхтаваліся, насеньне ёсьць, сілы ёсьць — дык чаго-ж нам, якія ніколі не адставалі, адставаць?

Сьцяпанаў Іван

Ударнік калгасу імя XII гадавіны Кастрычніка

У калгасе жыву ў дастатках

— Цяжкае было маё жыцьцё раней, што і казаць. То каня ня было, то плуга, а хлеба заўсёды не хапала.

— Цяжка ўявіць сябе жыцьцё бедняка, які ня мае свайго каня, жыве на дзярэх дзесяцінах зямлі.

Так і перабіваўся ў вечным клопаце аб заўтрашнім дні. Што вымушан быў рабіць бядняк, калі ў яго не хапала хлеба?

Ішоў у заработкі да кулака, у ярмо ішоў.

Тры гады як я, калгасьнік Сьцяпанаў Іван ўжо ў калгасе, тры гады; як пазбавіўся кулацкай эксплёатацыі, пакончыў з аднаасобным жыцьцём. У калгасе куды лепш стала жыць, чым на аднаасобнай гаспадарцы. Цяпер я жыву у дастатках, цяпер ўжо ня трэба турбавацца аб тым, што няма хлеба. Разам са сваёй дачкой мы выпрацавалі за мінулы год 451 працадзень. Хлеба атрымаў 50 пудоў, бульбы 260 пудоў, гародніны 19 пудоў і г. д. Мы цалкам забясьпечаны да новага ўраджаю, да новага разьмеркаваньня.

Заўсёды перавыконваў нормы выпрацоўкі, бо ведаў, што працую на сябе, а не на кулака.

Так за кароткі час я, з бедняка ператварыўся ў серадняка.

Добрасумленна працуючы, правільна скарыстоўваючы рабочую жывёлу, машыны, правільна апрацоўваючы зямлю, зьберагаючы калгасную ўласнасьць—у бліжэйшыя гады мы калгасьнікі станем заможнымі.

НА ФОТА-МАНТАЖЫ: Зьлева направа: тав. ІВАШЫН ВАСІЛЬ—брыгадзір брыгады № 1 нам. старшыні калгасу «Зьвязда», камсамолец-ударнік, [illegible] Калгас «Зьвязда» (Дзяржынскі р.) арганізаваў пробны выезд у поле, тав. БАБОК УЛАДЗІМЕР—брыгадзір брыгады № 2 лепшы ўдарнік калгасу «Зьвязда», за ўдарную работу прэміяваны



ЗА ГРАНІЦАЙ

Германія ў абцугох фашысцкага тэрору

Інквізіцыя па фашысцкі

ПАРЫЖ. 13-III. «Юманітэ» паведамляе, падрабязнасьці аб фашысцкім тэроры ў Германіі. Тысячы камуністычных і сацыял дэмакратычных рабочых кінуты ў турмы і канцэнтрацыйныя лягеры. Нацыянал-сацыялісты жорстка катуюць зьняволеных. «Дамы катаваньняў» маюцца ў Бэрліне на Фрыдрых-штрассэ—дом № 234, а таксама на Александэрпляц і Людэнштрассэ. Гітлераўцы ўжываюць нават забіраньне дзяцей рэвалюцыйных бацькоў. Арыштаваных змушаюць піць касторку. Мэтады інквізыцыі ўвайшлі ў звычай.

Рэйхстаг падпаліў штурмавы атрад

ПРАГА. 13-III. «РУДЫ ПАНЯДЗЕЛЬНІК» паведамляе з Бэрліну, што РЭЙХСТАГ ПАДПАЛІЛІ ШТУРМАВІКІ З ГІТЛЕРАЎСКАГА ШТУРМАВОГА АТРАДУ, ЯКІЯ ПРАЙШЛІ Ў РЭЙХСТАГ ПАДЗЕМНЫМ ХОДАМ З КВАТЭРЫ ГЕРЫНГА. Па сканчэньні падрыхтоўкі да падпалу шляхам цягненьня «жарэбка» (лёсу) было вырашана, хто з падпальшчыкаў павінен астацца ў рэйхстазе і ад дацца паліцыі. У якасьці ўзнагароды было абяцана 50.000 марак і вызваленьне з турмы пасьля двух месяцаў. Лёс паў на Ван Дэр Люббэ;—ён адмаўляўся, аднак яго змусілі астацца.

Страта СССР--поўная ізаляцыя Германіі

Цьвярозая перасьцярога друку

БЭРЛІН. 13-III. Блізкі да ўраду орган рэйнскай цяжкой прамысловасьці, «Рэйнішэ Вэстфалішэ Цэйтунг» адзначае, што «ворагі Германіі скарысталі апошнія падзеі ў Германіі ў якасьці повяду, каб у найбольшай ступені ізаляваць Германію». Вельмі небясьпечныя французкія камбінацыі,—піша газэта,—зьвязаны з СССР. СССР зьявіўся-б вельмі моцным зьвяном у ланцугу саюзаў, накіраваных супроць Германіі. Французам не перашкаджае, што ў Маскве мае ўладу камуністычны ўрад. Францыя хоча паступова адрэзаць Германію ад СССР і заняць яе месца. Далучэньне СССР да блёку дзяржаў, якія выступаюць супроць нас, было-бы раўнасільна амаль поўнай ізаляцыі Германіі».

Масавыя арышты па ўсёй Прусіі

БЭРЛІН. 13-III. Па ўсёй Усходняй Прусіі ў апошнія дні зроблены масавыя арышты і вобыскі.

У АЛЕНШТЭЙНЕ арыштаваны трое, якія распаўсюджвалі камуністычныя адозвы. У ГУТШТАЦЕ арыштаваны 3 камуністы. У раёне ЗЭНСБУРГ арыштавана 20 камуністаў. У ЛЕЦЭНЕ штурмавікі арыштавалі 30 актывістаў камуністычнай і сацдэмакратычнай партыі. У КЕНІГСБЭРГЕ і ў ГАЛЬЛЕ нацыянал-сацыялісты занялі памяшканьне рэфармісцкіх прафсаюзаў. У ШЛЕЗВІГ-ГАЛЬДШТЭЙНЕ 2 «невядомых», якія заявілі, што яны прышлі ад імя паліцыі, ўчыніць вобыск, зьявіліся на кватэру Гільскага адваката сац-дэмакрата Шпігеля і за білі яго. У ГІЛЕ арыштаваны рэдактар мясцовай сацдэмакратычнай газэты і кіраўнік «Рэспубліканскага сьцягу». У ваколіцы Бэрліну знойдзен труп мужчыны, забітага стрэлам у грудзі.

Герынг у паход сабраўся...

ФОТО-МАНТАЖ Я. КАШКЕЛЯ

Утварэньне міністэрства прапаганды

БЭРЛІН. 13-III. Агенцтва «Вольф» паведамляе: «Прэзыдэнт падпісаў дэкрэт аб утварэньні міністэрства народнай асьветы і прапаганды. Начальнікам гэтага міністэрства назначан кіраўнік аддзелу прапаганды нацыянал сацыялісцкай партыі ГЭБЭЛЬС, сакратаром — загадчык аддзелу друку—ФУНК.

Бэльгія ўзмацняе граніцу з Германіяй

ПАРЫЖ. Гавас паведамляе з Брусэлю: «У сувязі з паведамленьнем адной англійскай газэты аб пасыльцы войск для ўзмацненьня ўсходняй бэльгійскай граніцы, у Брусэлі заўважаюць, што гэтая ідэя толькі аб узмацненьні жандармэрыі з мэтай перашкодзіць пераходу граніцы германскім «камуністам».

„Германія—кіпучы кацёл"

Англійскі друк выкрывае змовы гітлераўцаў

ЛЕНДАН. 13-III. «Дэйлі Тэлеграф» зьмяшчае паведамленьне «вядомага знаўца міжнароднай палітыкі», які зрабіў паездку па Германіі. Паведамленьне зьмешчана пад загалоўкам «ТАЙНЫ НАЦЫЯНАЛ - САЦЫЯЛІСЦКІХ ЗМОВАЎ ВЫКРЫТЫ». У паведамленьні ўказваецца, што група ПАПЭНА - ГУГЕНБЭРГА ахоплена страхам, каб хаця нацыянал - сацыялісты не выпхнулі яе з ураду».

Пляны групы Папэна - Гугенбэрга, гаворыцца далей у паведамленьні, былі сарваны падпалам рэйхстагу. ГЕРМАНСКІЯ НАЦЫЯНАЛІСТЫ ГЛЫБОКА ПЕРАКОНАНЫ, ШТО ГЭТЫ ПАДПАЛ БЫЎ АРГАНІЗОВАН ГЕРЫНГАМ З МЭТАЮ ЗАВАЯВАЦЬ НЯЎСТОЙЛІВЫХ ВЫБАРШЧЫКАЎ НА БОК ГІТЛЕРЫЗМА. ВЭРСІЯ, БЫЦЦАМ ПАРЛЯМЭНЦКІ БУДЫНАК БЫЎ ПАДПАЛЕН КАМУНІСТАМІ, НЕ ВЫКЛІКАЕ ЗАРАЗ ДАВЕР'Я НІ Ў АДНОЙ АДКАЗНАЙ АСОБЕ ГЕРМАНІІ. Апрача таго, Герынг трымаў ужо напагатове дэлую сэрыю дэкрэтаў і рэгрэсыўных мер як быццам ён раней ведаў, што за гэтую ноч у Бэрліне павінна адбыцца нешта сэнсацыйнае.

Непасрэдна перад выбарамі ў Бэрліне існавалі два пляны, якія датычыліся ГІНДЭНБУРГА. Нацыянал-сацыялісты мелі намер уварвацца ў прэзыдэнцкі палац, прымусіць Гіндэнбурга адмовіцца ад улады і гэтым самым расчысьціць шлях для Гітлера. Група-ж Папэна спрабавала падстроіць, каб прэзыдэнт выехаў у Дэбэрыц на ваенны агляд, і такім чынам прыняць яго з дарогі, але выпадкова абодва пляны дайшлі да ведама правадыроў гэтай коаліцыі. У выніку гэтага атрады «стальнога шлёма» ў колькасьці 25.000 чал. узялі кантроль над Бэрлінам і плян у адносінах да прэзыдэнта ня быў зьдзейснены. Далей у паведамленьні ўказваецца, што Германія становіць сабою кіпучы кацёл, і што цяжка ўявіць далейшыя падзеі

Узброеныя штурмавікі ў нэйтральнай зоне

ЛЕНДАН. 13-III. Як паведамляе «Ньюс Кронікл» нацыянал - сацыялісцкія штурмавікі 12 сакавіка ўвашлі ў Шпайер, у рэйнскай нэйтральнай паласе, недалёка ад французкай граніцы і занялі ўрадавыя будынкі.

Польска-данцыгскі канфлікт

ВАРШАВА. 13. Данцыгскі карэспандэнт газэты «Дзеньнік Быдгоскі» піша: «Ужо пасьля германскіх выбараў можна было заўважыць сярод нацыянал-сацыялістаў у Данцыгу ўзбуджэньне, якое сьведчыць аб кіруемай з Бэрліну падрыхтоўцы якіхсьці выступленьняў. Падрыхтоўваўся ўзрыў пара хавой бочкі, які павінен быў паслужыць сыгналам германскай інтэрвэнцыі. Першым актам павінен быў быць напад нацыянал-сацыялістычных банд на польскія склады зброі ў Вэстэрплятэ, потым дзеяньні павінны былі пашырыцца на ўвесь Данцыг».

Далей газэта паведамляе, што «ужо некалькі дзён у Данцыгу ідуць ваенныя падрыхтоўкі. Мабілізуюцца, разьмяшчаюцца на казармах і атрымоўваюць зброю ўсе ваенныя арганізацыі.

Створаны санітарныя пасты. Сэнат тлумачыць, што падрыхтоўка робіцца з прычыны камуністычных выступленьняў, якія маюць быццам выбухнуць.

Фальшывасьць гэтых тлумачэньняў відна з падрыхтоўкі нацыяналістамі нападу на Вэстэрплятэ і на ўсе польскія ўрадавыя памяшканьні».

Польскі ўрад накіраваў Данцыгскаму Сэнату новую ноту «пратэсту супроць палётаў Данцыгскіх аэраплянаў над Вэстэрплятэ.

Толькі Талачынская, Танежыцкая, Капыльская, Слуцкая, Буда-Кашалеўская, Менская і Старобінская МТС скончылі рамонт трактароў

ЗВОДКА

ХОДУ РАМОНТУ ТРАКТАРОЎ ПА БССР на 12 сакавіка 1933 г.

Рэспубліканскі плян рамонту [2837] трактароў, адрамантавана [1537], або [54,2] проц. да пляну; прырост за дзень [2,4] проц.

Па Ленатрактарацэнтру

Неабходна адрамантаваць [623] трактары, адрамантавана [347], продамантавыканьня [55,7].

Дырэктар тав. ПУШЧЫН.

Да скончаньня рамонту трактароў асталося 3 дні, а ленатрактарацэнтр замест таго, каб узьняць тэмпы рамонту, ганебна здаў іх. Прырост за 11 сакавіка складае толькі 0,3 проц., за 12 сакавіка — 1,8 проц. За апошнія два дні па ўсёй сыстэме адрамантавана толькі 13 трактароў. Паранейшаму зрываюць рамонт наступныя МТС: Вешанковіцкая, якая выканала на 6,9 проц. (дырэктар Агееў), Крупская—18,2 проц. (дырэктар Бобрык); Шклоўская—25 проц. (дырэктар Зялінкоўскі) 1 г. д.

Па Зернятрактарацэнтру

Патрэбна адрамантаваць [342] трактары, адрамантавана [244], што складае [71,1] проц. пляну.

Дырэктар тав. ДУБОЎСКІ

Адной з прычын, якая зрывае выкананьне пляну рамонту трактароў, зьяўляецца тое, што кіраўніцтва трактарацэнтру працуе наскокам мэханічна, яна ня здольна вабясьпечыць сыстэматычнае і нармальнае выкананьне пляну. Аб гэтым в усёй ясьнасьцю сьведчыць той факт, што за 11 сакавіка па ўсёй сыстэме ня быў адрамантаваны ніводны трактар, а за 12 сакавіка—8 трактароў. Гэта ўжо ўвайшло ў практыку работы зернятрактарацэнтру. Тут прызвычаіліся да гэтага ганебнага зьявішча—«дзень працаваць, два здрачываць».

Асабліва зрываюць рамонт — Хойніцкая МТС, якая адрамантавала 19,2 проц. (дырэктар Галлеўскі); Пухавіцкая—29,2 проц. (дырэктар Шаблоў); Бягомльская—45 проц. (дырэктар Буйноў).

Па гародня-бульбянаму трактарацэнтру

Неабходна адрамантаваць [517] трактароў, адрамантавана [340], або [65,8] проц. пляну

Дырэктар тав. ГРАБЕНЧЫК

Прырост за дзень па гэтаму трактарацэнтру складае 1,2 проц. Лічба яўна недавальняючая. Гэта лічба сьведчыць аб тым, што кіраўніцтва трактарацэнтру не разгарнула належнай барацьбы за выкананьне пляну. У той час як пасобныя МТС, як Буда-Кашалеўская і Менская, скончылі рамонт, значная частка МТС ганебна плятуцца ў хвасьце. Да такіх адносіцца: Барысаўская МТС, якая адрамантавала 12 пр. трактароў (дырэктар Хіліс); Магілеўская 37,5 проц. (дырэктар Банчук); Рэчыцкая—37,9 проц. (дырэктар Рашкоў).

Па Наркамсаўгасаў

Плян рамонту [700] трактароў, адрамантавана [350], што складае [50] процантаў.

Адказны за рамонт тав. БІМБАТ

Прырост за дзень па Наркамгаўгасаў складае 6,4 проц. Калі ўлічыць, што сыстэма Наркамсаўгасаў ганебна плятуцца ў хвасьце ўсіх трактарацэнтраў БССР у справе выкананьня пляну рамонту, дык прыведзеная лічба прыросту гаворыць аб тым, што кіраўніцтва яўна ігнаруе дырэктаву партыі і ўраду аб скончаньні рамонту да 15-га сакавіка.

ЗАУВАГА: сэктары ўліку і справаздачнасьці Наркамзему і Трактарцэнтру ня здолелі паставіць як належыць уліку МТС, яны ня прымаюць належных захадаў да тых, якія не жадаюць прысылаць зьвесткі. У выніку гэтага зводка па 18 МТС складзена на 12 сакавіка, а па астатніх—па папярэдніх даных.

Паведамленьне АДПУ

Праведзеным АДПУ расьсьледваньнем раду нечаканых і сыстэматычна даўтарыўшыхся аваярый, якія мелі месца ў апошні час на буйных элек трастанцыях (Маскоўская, Чэлябінская, Зуеўская, Закаўказкая), устаноўлена, што аварыі гэтыя зьяўляюцца вынікам шкодніцкай дзейнасьці групы шкодніцкіх элемэнтаў з ліку дзяржаўных служачых у сыстэме Наркамату цяжкай прамысловасьці, якія паставілі сабе мэтай эрўнаваньне электрастанцый СССР. Дывэрсыйная дзейнасьць і вывад з строю абслугоўваемых гэтымі станцыямі дзяржаўных заводаў. Расьсьледваньне паказала, што ў дзейнасьці гэтай шкодніцкай групы прымалі ўдзел такса ма некаторыя служачыя англійскай фірмы «Мэтрапалітэн-Вікерс», якія працуюць у СССР на аснове дагавору з гэтай фірмай аб тэхнічнай дапамозе прадпрыемствам электрапрамысловасьці СССР Арыштаваны па справе:

1. Гартэнштэрн Бернгард Барысавіч, галоўны інжынэр электратэхбуду ВЭО.
2. Крашэніньнікаў Міхаіл Дзьмітравіч, галоўны інжынэр першага Могэс.
3. Ізюраў Васіль Александравіч, кансультант Вэо.
4. Жылкін Уладзімер Сьцяпанаў, нам. заг. аддзелу Могэса.
5. Сэліванаў Андрэй Паўлавіч, былы. нам. заг. вытворча-мантажнага аддзелу трэста Энэргабуд.
6. Сухаручкін Леанід Александравіч, нам. галоўнага інжынэра першай Магэс.
7. Ястрэбава Соф'я Дзьмітрыеўна, інжынэр Могэса.
8. Мураташ Васіль Васільевіч, стар шы інжынэр арг. Энэрга.
9. Швальбах Альфонс Іванавіч, член ЦЭС Галоўэнэрга.
10. Вільсон Іван Іванавіч, інжынэр Магэс.
11. Карынскі Вячэслаў Алексеевіч, інжынэр Масэнэрга.
12. Пераў Уладзімер Александравіч, старшы інжынэр Электраімпорту.
13. Гусеў Васіль Алексеевіч, начальнік электрастанцыі мэталюргічнага заводу ў горадзе Златаўсьце на Урале.
14. Гаеўскі Адольф Станіслававіч, галоўн. мэханік мэханічнага завода ў горадзе Златаўсьце на Урале.
15. Сокалаў Васіль Андрэевіч, галоўн. электрык мэталюргічнага заводу ў Златаўсьце на Урале.
16. Выдвіцкі Нікалай Пятровіч, галоўны інжынэр Чэлябдрэса на Урале.
17. Нэандэр Міхаіла Фёдаравіч, старшы інжынэр сэктару эксплёатацыі Галоўэнэрга.
18. Патулаў Аляксандр Уладзімеравіч, інжынэр Масэнэрга.
19. Калакуцкі Фёдар Аляксеевіч, інжынэр Шатурскай Дэс.
20. Левашоў Канстанцін Іванавіч, інжынэр Магэса.
21. Зорын Нікалай Грыгоравіч, інжынэр Масэнэрга.
22. Ялавецкі Уладзімер Антонавіч інжынэр Масэнэрга.
23. Крэчэтаў Генадзій Пятровіч, інжынэр Масэнэрга.
24. Марын Барыс Нікалаевіч, інжынэр Саюзэлектра.
25. Магідсон Барыс Нікалаевіч, інжынэр Саюзэлектра.
26. Торытон Лесьлі галоўны мантажны інжынэр фірмы «Мэтрапалітэн-Вікерс».
27. Монкгаўз Аллан, прадстаўнік фірмы «Мэтрапалітэн-Вікерс».
28. Магданальд Вільям, інжынэр фірмы «Мэтрапалітэн-Вікерс».
29. Кушын Джон, інжынэр фірмы «Мэтрапалітэн-Вікерс».
30. Нордвол Чарлі, мацнёр фірмы «Мэтрапалітэн-Вікерс».
31. Грэгары, Мацнёр фірмы «Мэтрапалітэн-Вікерс».

Пасьля допыту вызвалены з адабраньнем падпіскі аб нявыезьдзе: Селіванаў Андрэй Паўлавіч, Швальбах Альфонс Іванавіч, Ястрэбава Соф'я Дзьмітраўна, Монкгаўз Аллан, Нордвол Чарлі.

Сьледзтва прадаўжаецца.

ПАЗЫКА „ПЯЦІГОДКА-У ЧАТЫРЫ ГАДЫ"

Табліца 9-га тыражу выйгрышаў дзяржаўнай выйгрышнай пазыкі „Пяцігодка—у чатыры гады"

Тыраж адбыўся ў гор. Віньніцы 25—28 лютага 1933 году

А. Выйгрышы па 200 рублёў выпалі на аблігацыі наступных сэрый беспроцантна-выйгрышнага выпуску:

№№ сэрый	№№ сэрый	№№ сэрый	№№ сэрый	№№ сэрый	№№ сэрый	№№ сэрый	№№ сэрый	№№ сэрый
00304 п	12242	23252	33511	44137	55121	66087	77338	88617
00338	12295	23373	33525	44150*)	55382	66220	77370	88682
00358	12450	23442 т	33743	44350	55408	66298	77631	88709
00538	12586	23563	33924	44682	55494	66363	77996	88738
00659	12703	23594	33930	45790	55602 т	66493	78000	88753
00922	12867	23697	34580	45847	55656	66757	78006	88773
01100	13209	23965	34676	45850	55706	66966	78230 т	89035
01230	13216	24126	34823	45887	55929	67191	78353	89136
01381	13319	24260	35019	46224 т	56175	67223	78898	89160
01396	13365	24341 т	35039	46227	56213	67321	79182	89597
01421*)	13577	24538 т	35079	46378	56478	67574	79218*)	89645
01704	14049	24716	35188	46572	56684 т	68316	79357	90209
01874	14146	24727	35249	46581	56712	68414	79430	90234 т
02127	14484	24900	35366	46700	56830	68464	79651	90401*)
02291*)	14496	24919	35450	46713	56882 т	68488	79794	90460
02323	14592	25016	35568	46724	56994	68553	80057	90681
02330	14704	25105	35653	47016	56996	68944	80145	91330
02689	14880	25266	35685	47090	57304	69065	80148	91517
02967	14947	25455	35823	47113	57340	69119	80259	91522
03355	15030	25493	35826	47944	57492	69125	80547	91631 п
03825	15195	25863*)	36237	48332 п	57666	69177	80736	91671 п
03835	15347	26079	36402	48562	58015	69279	80865	91927
03874	15407	26197	36643	48663	58475	69650	80900	91963
03946	15512	26307	37415	49042 т	58589	69875	81014	91983
04099*)	15613	26437	37509	49449	58694	70220 п	81278	92182
04250	15720	27222	37529	49586	58822	70452	81348	92432
04616	15784	27283	37911	49629	58901	70572	81599	92522
04653	15854	27364	38095	50678 т	59209	70814 п	81612	92669
04713	16172	27404	38149	50712	59420	71176 п	81715	92703
04993	16354	27484	38172	50759	59493	71435	81740	93069
05344	16512	27583	38362	50890	59543	71647	8 744	93778
05437	16538	27797	38463	50941	59553	71906	81829	93873
05476	16732*)	27823	38594	51014	59582	72530	82340	93953
05526	16805	27940	38669	51194	59628*)	72697	82378	93969
05566 т	16900	28097	39468*)	51250	59928	72735	82853	93979
05635	16998*)	28107	39608	51337*)	60139	72766	82892	94015*)
05666	17107	28354	39981	51622 т	60532	72851	82992	94255
06020	17226	28628	40134	51741	60829	73119	83108	94447
06059	17283	28887	40174	51782	61128	73373	83304	94971
06206	17681	28982 п	40297	51791	61316	73387	83349	95329 п*)
06540	17823	29037	40358	51800	61322	73819	83617	95592*)
07455	17846 т	29127	40364	52105	61357	73908	83727	95715
07725	17890	29144	40589	52252	61538	73985	83934	95980
07762	18618	29337	40610	52412	61591	74068	84038	96368
07965*)	18657	29583	40714	52449	61640	74156	84070	96443
08120	18772	29862	40724	52522	62044	74332	84841	96498
08165	19089	29940	40817	52577	62180*)	74430	85194	96562 п
08593	19122	30049	41023	52649	62240	74717	85720	96832
08734	19160	30393	41139	52676	62345	74916	85881	96868
08912	19272	30429	41421 т*	52895	62722*)	74925	86143	97055
09042	19609	30636	41449	52995	62740	75059	86195	97064
09085	19618	30736	41724	53106	62808 п	75511	86576	97154
09198	20094*)	31003	41953	53430	63297	75567	86596	97205
09480	20200	31050	41973	53487	63341	75955	86804	97363 п
09494	20230 п	31550	42119	53673	63401	76080	86871	98389
09559 т	20486	31685	42164	53761	63571	76147	87063	98804
09906	20666	31768	42817	53939	64348	76211	87303	98952
09933 т	20795	32062	42953 п	53978	64365	76425	87377	98957
10059	20801	32480	43251	54046	64372 п	76524	87429 т	98989
10116	21353	32491	43324	54727*)	64643	76556	87431	99043
10667	21425	32650	43355	54889 т	64688 п	76629	87510 п	99082
10882	21712*)	32680	43461	54986	64786	76971	87753	99488
11002	22 61	32848	43577	55008	64821	77067	87861	99670
11163*)	22995	32912	43605	55013	64873 п	77209	87966	99808
11328	23210	33094	43995	55075	65196	77264	88080	99926
11825	23221	33160	44026	55082	65678	77326	88118	99984
11907	23242	33224 п	44108	55098	65766			

Б. Выйгрышы ў 1.000 і 5.000 рублёў выпалі на наступныя нумары сэрый і аблігацый беспрацэнтна-выйгрышнага выпуску.

№№ сэрый	№№ аблігацый	Сума выйгрышаў у руб.	№№ сэрый	№№ аблігацый	Сума выйгрышаў у руб.
01421	10	1.000	44150	09	1.000
02291	01	1.000	51337	01	1.000
04099	07	1.000	54727	02	1.000
07965	01	1.000	59628	07	1.000
11163	08	1.000	62180	05	5.000
16732	06	1.000	62722	10	1.000
16998	09	1.000	79218	08	1.000
20094	07	1.000	90401	07	1.000
21712	07	1.000	94015	03	1 000
25863	03	1.000	95329 п	02	5.000
39468	01	1.000	95592	06	1.000
41421 т	02	5.000			

А. Выйгрышы па 200 рублёў выпалі на аблігацыі працэнтна-выйгрышнага выпуску наступных сэрый

№№ сэрый	№№ сэрый	№№ сэрый	№№ сэрый	№№ сэрый	№№ сэрый	№№ сэрый	№№ сэрый	№№ сэрый
00322	14265	26525	37903	51740	61997	68210	79574	90627
00636	14567	27350	38313	52606	62184	68448	80149	91051
00870	14770	27585	38931	53260	62195	68816	80237	91722
01153	14813	27674	40867	43402	62297	69394	80417	92619
02228	14977	28554	41799	54092	62451	69399	81658*)	92905
02687*)	15036	29382	42005*)	54234	62504	70751	82281	92944
03141	16128	29585	42400	54690	62710	71393	83033	93575*)
03332	16144	30843	42572	54710	62713	71453	83737	91105
03830	16149	30988	42967	55891	63248	71796*)	84525	94636
03857	16199	30992	43476	56205	63916	71965	84567	94659
04365	17103	31010	43829	56625	64196	72072	84588	94886
04717	17239	31090*)	44292	57583	64605	72458	84596	95046
05475	17477	31139	45252	58280	64651	72639	84867	95731
05846	18826	31612	45389	58294	64741	72662*)	84962	96121
06621	19088	31827	45491	58411	65451	74726	85298	96138
06875	19428*)	31853	45619	58557	65819	74939	85546	96180
07071	20681	32073	45625	58641	65950	75005	85783	96378
07948	20952	32816	46050	58758	65952	75876	85786	96826*)
07976*)	21489	34307	47987	59248	66022	76187	86245	96903
08283	22274	34462	47997	59298	66275*)	76212*)	86583	98019
08463	22710	35046	48358	59414	66573	76229	86622	98224
09137	22887	35275	49159*)	59616	66610	76339	87174	98472
10041	23164*)	36712	49207	60298	67185	76704*)	87985	98915
10835	23275	36889	49351	61029	67193	77189	88334	99502
11251*)	23562	36960*)	50139	61407	67290	78458*)	88349	99572
11967	23831	37299*)	50877	61651*)	67578	78619	88829	99635
12162	25217	37654	51103	61959	68074*)	78731	89353	99661
13895	26425	37779	51372					

Б. Выйгрышы ў 1.000 і 5.000 рублёў выпалі на наступныя нумары сэрый і аблігацый працэнтна выйгрышнага выпуску

№№ сэрый	№№ аблігацый	Сума выйгрышаў у руб.	№№ сэрый	№№ аблігацый	Сума выйгрышаў у руб.
02687	01	1.000	66275	09	1.000
07976	09	1.000	68074	09	1.000
11251	10	5.000	71796	01	1.000
19428	05	1.000	72662	05	1 000
23164	10	1.000	76212	09	1.000
31090	09	1 000	76704	01	1.000
36960	09	1.000	78458	08	1.000
37299	03	1.000	81658	09	1.000
42006	01	1.000	93575	08	1.000
49159	08	1.000	96826	03	1.000
61651	09	1.000			

Зноска *) (зорачка), якая знаходзіцца ў некаторых нумарох сэрый, паказвае, што адзін з нумароў аблігацый гэтых сэрый, выйграў 1.000 або 5.000 руб.

Зноска «т» азначае, што выйгрыш выпаў на все 10 аблігацый, указаных сэрый па 3 пазыцы індустрыялізацыі.

Зноска «п» азначае, что выйгрыш выпаў на ўсе 10 аблігацый, указаных сэрый па пазыцы «пяцігодка ў 4 гады».

КІНО ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ
Каса ад 12 г. дню

Ад 13 сакавіка мастацкі фільм
ДАЧКА РАФКЭ

Віцебская дзяржаўная панчошна трыкатажная фабрыка імя „Кл. Цэткін"
Віцебск, Пушкінская, 14
ПРАДАЕ наступныя матар'ялы:
1. Абажуры жалезныя, глыбокія, настольныя,
2. Амперметры і вольтметры,
3. Заклёпкі капёльныя,
4. Рамень прывадны, абіўны,
5. Крукі ізаляторныя, сярэднія,
6. Шківы для вязальных машын,
7. Шпонк—для дызэля, 8. Ролікі фарфарныя,
9. Шчоткі вугальныя для матораў розныя,
10. Шкло вадамернае, 11. Палатно вяжучае,
12. Арматура на 3 лямпы з патрон. і шклом.

УКРАДЗЕНА круглая пячатка з надпісам: «ЦП саюзу рабочых Торфсляндзавай прамысловасьці Беларусі Лічыць несапраўднай

СЫШОЎ ХЛОПЧЫК Жорж Іванаў Краўчэнка 10 год, апрануты ў зоўгае паліто, у ботах. Хто ведае месца яго знаходжаньня, паведаміць па адрасу: Глускі раён, с. Слабада, Івану Іванаву Краўчэнка

КОШТ АБ'ЯВЫ аб згубе 2 рублі

Пра выкананьне дырэктыў аб рабоце ашчадкас

Пастанова Камісіі выкананьня пры СНК БССР

Заслухаўшы даклад Начальніка Кіраўніцтва ашчадных кас і дзяржкрэдыту БССР т. Саўкова, аб рабоце ашчадных кас і садаклад прадстаўніка НК РСІ т. Дагмана, Камісія Выкананьня пры СНК БССР лічыць устаноўленым, што:

а) Буда-Кашалёўскі, Бягомльскі, Барысаўскі, Бабруйскі, Быхаўскі, Веткаўскі, Дубровенскі, Крупскі і Парыцкі раённыя выканаўчыя камітэты ня выканалі пастановы СНК БССР ад 7 сьнежня 1932 г. № 588 аб рабоце ашчадных кас у частцы прадастаўленьня ашчадкасам памяшканьняў; Горацкі, Лагойскі, Слуцкі, Бялыніцкі, Прапойскі і Лёзьненскі раённыя выканаўчыя камітэты мабілізоўвалі і не ракідвалі работнікаў ашчадкас на іншыя работы бяз згоды НКФіну БССР, чым парушылі паказаную пастанову; Смалявіцкі і Расонскі раённыя выканаўчыя камітэты мабілізавалі работнікаў ашчадкас на іншыя работы, не ўзмацнілі работы ашчадкас і дапусьцілі зачыненьне кас да 3-х месяцаў і поўны іх развал; Любаньскі, Чавускі і Пухавіцкі раённыя выканаўчыя камітэты ня выканалі паказаных пастановы СНК БССР аб вылучэньні ў 15-ці дзённы тэрмін загадчыкаў раённых ашчадкас; значная частка раённых выканаўчых камітэтаў ня толькі не забясьпечыла сыстэматычнага кіраваньня ашчадкасамі, але нават не заслухоўвала дакладаў аб іх рабоце;

б) Кіраўніцтва ашчадкас і дзяржаўнага крэдыту БССР не рашуча ставіла пытаньне аб паказаных фактах перад кіруючымі органамі, нездавальняюча ажыцьцяўлена кіраваньне нізавой сеткай ашчадкас і не палепшыла апэрацыйнай тэхнікі ў справе абслугоўваньня ўкладчыкаў і пазыкатрымальнікаў;

в) за апошнія 6 месяцаў значна павялічылася колькасьць растрат у ашчадкасах і Народны Камісарыят Юстыцыі праводзіць недастатковую барацьбу з растратамі.

З прычыны паказаных недахопаў ашчадныя касы БССР ня толькі не ліквідавалі прарываў у выкананьні пляну ў 1932 г., але яшчэ паглыбілі прарыў у 1 квартале 1933 г., даўшы адліў укладаў на 1.462,9 тыс. руб., не давыканалі заданьне па рэалізацыі пазыкі на 32,8 проц., у тым ліку па вёсцы на 51,6 проц., выканаўшы плян па грашовых паступленьнях па пазыцы на 42,2 проц., па асабістым страхаваньні на 28,4 проц.

Камісія Выкананьня пры СНК БССР пастанаўляе:

1. Старшыням Смалявіцкага РВК т. Козінцаву і былому старшыні Расонскага РВК т. Шкутко за яўнае ігнараваньне пастановы СНК БССР ад 7 сьнежня 1932 г. № 588 аб палепшаньні работы ашчадкас, за дапушчэньне зачыненьня кас да 3-х месяцаў, нягледзячы на папярэджаньне ЦВК, абвясьціць суровую вымову.

Даручыць Пракуратуры Рэспублікі выявіць канкрэтных вінаватых у гэтай справе і прыцягнуць і